

*Новая матура* ☞ 3

# Ніва

## ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

*ПЯТРО ГАГАН* ☞ 8



http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 47 (2532) Год XLIX | Беласток, 21 лістапада 2004 г. | Цана 2,00 зл.

*Самай папулярнай формай дапамогі з'яўляецца г.зв. сямейная ўспамога. Можна атрымаць грошы на даезд дзіцяці ў школу, або на даплату да кватэрнай платы, калі кватарант у ёй прапісаны. Сума тут таксама невялікая — 80 злотых. Такая дапамога выдаецца толькі ў час навукі — з 31 жніўня па 1 мая...*

# Звесці канцы з канцамі




Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

*У Нарваўскай гміне пад пастаяннай сацыяльнай апекай знаходзіцца 26 сем'яў*

Пасярэдзіне кухні ў спадарства Д. гуляюць кацяняты. На стале прыадкрыты слой з агуркамі і бляшаная міска з таўканіцай. Тут жа валяецца ўпакоўка з-пад шакаладак „Merci".

— Кава ці гарбата? — пытае мяне нясмела гаспадыня. З кожнага кутка хаты вызірае неахайнасць, бязраднасць.

— Чаму беспрацоўныя і бедныя? — гадае ўголас Д., — мусіць, таму, што без школы...

Д. доўга захвальвае *свае пані* з сацыяльнай дапамогі. Каб не яны — мы загінулі б як рудыя мышы!

Усё ім даюць: і кансервы, і бялізну, і нават цацкі для дзяцей. А якія „пачкі" для пяці іх школьнікаў адшыкавалі. І наплечнікі, і *тэмпэрувкі* ўсялякія, і выцінанкі — чаго там не было!

На што ідуць грошы з сацыяльнай апекі?

— На ўсё, — азываецца невялічкі бацька сям'і, які разам з жулікаватымі малечамі сядзіць на версальцы і ўголас каменціруе кожны правальны крок у „Фаміліядзе".

— Зялёны як елачка! — кідае ў адрас героя тэлетурніру, пана Пётра, які дрэнна адказаў на пытанне.

### *За такія грошы не пракорміш*

Хто сёння карыстаецца сацыяльнай дапамогай?

За адказам на гэтае пытанне мы звярнуліся ў Гмінны асяродак сацыяльнай дапамогі ў Нарве.

— Ёсць сем'і, якія пастаянна знаходзяцца пад нашай апекай, — кажа Лідзія Пост, кіраўнік Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі. Звычайна, яны мнагадзетныя, часам даходзяць алкагольныя праблемы або хваробы.

У Нарваўскай гміне пад пастаяннай сацыяльнай апекай знаходзіцца 26 сем'яў. Цікава, што ўсе (апрача аднаго выпадку) датычаць жыхароў вёсак, у якіх сякія-такія гаспадаркі. Але дапамога тут сімвалічная — 92 злотых. Каб пражыць, трэба шукаць іншых крыніц заработку.

— Напэўна за такія грошы не пракорміш сям'і, — кажа Альжбета Лявіцкая, сацыяльны працаўнік. — І людзі робяць усё, каб звесці канцы з канцамі. Хто падзарабіць на зёлках, хто па грыбы ў лес сходзіць, або наймаецца ў гаспадара да гною ці да капання бульбы. Ды неабавязкова за грошы. За мяшок бульбы, або за кусок мяса...

Самай папулярнай формай дапамогі з'яўляецца г.зв. сямейная ўспамога. Карыстаюцца ёю 103 асобы. Можна атрымаць грошы на даезд дзіцяці ў школу, або на даплату да кватэрнай платы, калі кватарант у ёй прапісаны. Сума тут таксама невялікая — 80 злотых. Такая дапамога выдаецца толькі ў час навукі — з 31 жніўня па 1 мая.

Гмінная апека фінансуе таксама каля 80 абедаў у школьнай сталоўцы. Вось, напрыклад, за бягучы месяц заплацілі больш за 3 тыс. зл. Ёсць таксама мэтавая дапамога (ад 100 да 300 зл.), якой, цягам апошняга года, пакарысталася 45 асоб.

— Час ад часу мы фінансуем лякарствы беспрацоўным, або, як апошнім часам, фінансавалі электраўстаноўку ў Доме самотнага чалавека.

### *Шакалад раз у месяц*

Калі паслухаеш навін са свету — уся краіна, здавалася б — патанула ўжо ў зладзействе і карупцыі. А ў Нарве саромеюцца браць „дармовыя" грошы. Іншая справа — у вяскоўцаў мінімальныя патрэбы: дах над галавой, ежа, вопратка. Амбіцыі пераходзяць на дзяцей. — Нашы падапечныя звычайна саромеюцца, калі прыходзяць па грошы, — кажуць ва Управе гміны.

Наогул усе патрабуюць ананімнасці. Зразумела, затойваюць гэты факт перад знаёмымі, суседзямі. Чаму? Баяцца, каб не палічылі іх горшымі і няўдачнікамі. Тым больш, што ў Нарваўскай гміне ніхто не верыць у рэальнае беспрацоўе (беспрацоўе тут — 6 працэнтаў і датычыць перш за ўсё жанчын). Прадпрыемства „Пронар" не толькі прымае на працу, але яшчэ плаціць прыстойныя грошы. Аднак тут абавязвае строгая дысцыпліна — у фірме нельга парушыць сухі закон, інакш вылятаеш з воўчым білетам.

Сям'я Д., дзе чуць не тузін дзяцей, хоць і карыстаецца сацыяльнай дапамогай, аднак у асноўным жыве з гаспадаркі.

— А ці праўда гэта, што за кожнае дзіця Лукашэнка тысячу долараў плаціць? — пытае яшчэ ў брамцы спадар Д. Чуў па тэлебачанні. Калі кажу што менш — чую ноты расчаравання. Бо каб жыў у Беларусі — за тыя грошы ў горадзе пасяліўся б. Вёска дарагая, але дзецям вучыцца трэба.

— *Добрэ што ім троху дапамагают*, — кажа суседка Д., бабуля пад семдзесят. — Яны людзі нахітрыя, справядлівыя. Хоць бедныя, але раз у месяц сабе шакаладу накупляюць!

**Ганна Кандрацюк**

## *Усё на падазрэнні* ☞ 2

Яўген Міраповіч

*Беларускія ідэалісты заснавалі партыі і арганізацыі, хацелі браць удзел у пабудове беларускага дэмакратычнага грамадства. Ад самага пачатку сачылі за намі вочы вялікага брата. Не давяралі нам, пагранічнікі запісвалі кожнае наша перасячэнне мяжы з Беларуссю. Некалькі гадоў толькі сачылі, не перашкаджалі працаваць. Цяпер, відаць, памянялі тактыку...*

## *Забароненая мова* ☞ 2

Сакрат Яновіч

*Праект сучаснага закону— скажам — праваляўся ў сеймавых канцылярыях каля дванаццаці гадоў. Прапіхваў яго незабыўны Яцак Курань; хоць і салідарніцкі герой, аднак бяссільны пад сцяною польскага нацыяналізму. Талерантнасць палякаў аказалася вось самахвальствам. Яны папраўдзе вылітыя саветы ў нецярпімасці да нас...*

## *Няма чым хваліцца* ☞ 4

Аляксей Мароз

*Танныя крэдыты і рэальны прыбытак ад невялікіх гаспадарак давалі магчымасць хутка палепшыць умовы жыцця на вёсках. Мода на каляровыя драўляныя і жалезныя агароджы паявілася пазней. Яшчэ ў дзевяностых гадах некалькі маладых гаспадароў, якія рашыліся разгарнуць сельскагаспадарчую дзейнасць, паставілі новыя дамы...*

## *Як быць з Беларуссю* ☞ 5

Мацей Халадоўскі

*Вінцук Вячорка: Патрэбны крок, каб ліквідаваць у Беларусі пачуццё страху і недаінфармаванасці. Беларусь стаіць перад цывілізацыйным выбарам і недахопам кадраў, якія б запоўнілі прабел пасля ліквідацыі вертыкальнай дыктатуры. Неабходна павялічыць сродкі на салідарнасць з праследаванымі....*

## *Юбілей „Васілёчкаў"* ☞ 8

Віктар Бура

*На першую арганізацыйную рэпетыцыю прыйшлі чатыры жанчыны і адзін мужчына, на другую — трошкі больш на чале з будучым дырыжорам Аляксандрам Лукашуком. Ён аказаўся цудоўным музыкантам, чалавекам вельмі артыстычнай натуры...*

## *Успамінанне Пецюкевіча* ☞ 9

Гражына Харытанюк

*Гэта быў адзін з нямогіх семінараў, прысвечаных беларускім дзеячам, а напэўна першы такі багаты, прысвечаны Мар'яну Пецюкевічу, падчас якога паявілася шмат новых інфармацый пра жыццё і дзейнасць беларускага этнографа...*

# Падазроныя: газета, школы, песні...



*На мінулым тыдні Раённая пракуратура Беласток-Поўдзень паклікала ў ролі падазроных пяць членаў Управы Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" папярэдняга склікання. Такім чынам спісак падазроных у злачынстве парушэння законаў аб бухгалтарстве дасягнуў адзінаццаці чалавек. Справу вядзе намеснік славутай ужо Бажэны Кішло — пракурор Анджэй Астапа. Калі такім тэмпам пракуроры ды іншыя службы будуць працаваць, неўзабаве абвінавачваць стануць таксама чытачоў нашага тыднёвіка. Судовы працэс трэба будзе праводзіць сама менш на стадыёне.*

*Хаця яшчэ далёка да стану-ідэалу канца трыццатых гадоў, калі кожны беларус быў падазроны, але ўсё ідзе ў гэтым напрамку. Чэкісты, паліцыянты, функцыянеры НІК, пракуроры ўсе яны выконваюць працу, за якую плацяць таксама беларусы са сваіх падаткаў. Выконваючы сваю працу, цалкам згодна з законамі, могуць праследаваць грамадзян беларускай нацыянальнасці. Маральны і псіхічны тэрор гэта адпаведныя тэрміны, якія адлюстроўваюць дзеянні ўлад у адносінах да беларускай інтэлігенцыі. Мы абараняць сваю годнасць можам толькі за кошт сваіх сродкаў і ў часе, у якім павінны працаваць, або адпачываць. Яны — звычайна прыходзяць на працу. Супраць беларускай інтэлігенцыі вайну вядуць людзі, у якіх руках дзяржаўны апарат рэпрэсіі. Вопыт гісторыі паказвае, што такая вайна можа цягнуцца пакуль будуць тут праявы беларускага нацыянальнага жыцця. Не стане справы „Нівы", прыдумаюць нешта іншае.*

*Няважна, хто будзе пры ўладзе — чырвоныя, карычневыя, ці чорныя — гэта этнічны канфлікт, выкліканы самай прысутнасцю беларусаў на Беласточчыне. Ён не мае тут нават рацыянальнага апраўдання. Час ад часу ў Польшчы прыходзяць да ўлады людзі, якія ажыццяўляюць мары аб этнічным адзінстве краіны. Робяць гэта вельмі паспяхова. Пасля вайны нацыянальныя меншасці ў Польшчы складалі 18 працэнтаў насельніцтва, сёння — менш за адзін працэнт. Дастаткова, напрыклад, каб найвышэйшая ўлада ў 1968 г. дала свабоду сваім прэтарыянцам, а дзесяткі тысяч яўрэяў вымушаных было ўцякаць з краіны, у якой іх продкі пражывалі ад некалькіх пакаленняў. Уцяклі таксама амаль усе немцы. Сёння адзінай меншасцю, на якую магчымым было беспакарна накіроўваць агрэсію, з'яўляюцца беларусы. Нехта, відаць, ацаніў, што беларуская інтэлігенцыя на Беласточчыне можа яшчэ доўга падтрымліваць тут прысутнасць нашай нацыянальнай супольнасці. Вырашылі тады стварыць такія ўмовы, каб ніхто не захацеў весці адкрытай дзейнасці, накіраванай на захаванне беларускай нацыянальнай тоеснасці. З аднаго боку афіцыйная балбатня пра еўрапейскія нормы, пашану нашых грамадзянскіх правоў, а з другога боку фактычна псіхічны тэрор у адносінах да людзей, якіх палічылі галоўнай перашкодай асіміляцыйным працэсам.*

*Маладая беларуская інтэлігенцыя зрабіла ў васьмідзесятых гадах вялікую памылку, паверыўшы ў магчымасць зaіснавання сапраўднай дэмакратыі ў Польшчы, у якой грамадзяне няпольскай нацыянальнасці мелі атрымаць аднолькавыя з палякамі правы. Беларускія ідэалісты заснавалі партыі і арганізацыі, хацелі браць удзел у пабудове беларускага дэмакратычнага грамадства. Ад самага пачатку сачылі за намі вочы вялікага брата. Не давяралі нам, пагранічнікі запісвалі кожнае наша перасячэнне мяжы з Беларуссю. Некалькі гадоў толькі сачылі, не перашкаджалі працаваць. Цяпер, відаць, памяняў тактыку.*

*Усё адбываецца тут як у лукашэнкаўскай Беларусі. Там пад лозунгам абароны правапарадку можна было знішчыць арганізацыі, выдавецтвы, свабоду слова, разбурыць беларускае нацыянальнае жыццё. На Беласточчыне антыбеларускую дзейнасць праводзяць такімі ж метадамі, нават прымяняюць такую ж аргументацыю — абарону дзяржаўных інтарэсаў. Прапаганда ўжо давяла да свядомасці грамадства, што выдаванне „Нівы" пагражае інтарэсам польскай дзяржавы. Заўтра, магчыма, стануць пагражаць школы, а ў канцы — народныя песні. Магчыма, арганізатары сучаснага антыбеларускага паходу нават не ўсведамляюць сабе, што ўсё гэта ўжо было, што гэта толькі санацыйна-эндэцкі рэцыдыў.*

**Яўген Міранові**

**ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР „ВЯСНА"**
**Мінск, пр. Ф. Скарыны, 78а-48**

Прэзідэнту Рэспублікі Польшча
Сп. Аляксандру Квасьнеўскаму
Амбасадару Рэспублікі Польшча
ў Рэспубліцы Беларусь сп. Тадэвушу Пайляку
Праграмнай Радзе штотыднёвіка „Ніва"

**Зварот**

**Праваабарончага цэнтру „Вясна" у абарону сяброў Праграмнай Рады штотыднёвіка беларусаў Польшчы „Ніва" і школ з вывучэннем беларускай мовы**

*Праваабарончы цэнтр „Вясна" занепакоены дзеяннямі дыскрымінацыйнага характару ў дачыненні да беларускай меншасці ў Польшчы.*

*Мы заклікаем звярнуць увагу на сітуацыю, якая склалася вакол тыднёвіка „Ніва" і школ з вывучэннем беларускай мовы на Беласточчыне.*

*Сябрам Праграмнай Рады штотыднёвіка беларусаў Польшчы „Ніва" — аўтарытэтным грамадскім дзеячам Яўгену Вапу, Яўгену Мірановічу, Міхасю Андрасюку, Юрыю Хмялеўскаму і Міхалу Стэльмашуку прад'яўлены абвінавачанні ў няправільным выкарыстанні грашовых сродкаў, выдаткаваных польскай дзяржавай на падтрымку выдання.*

*Паралельна з абвінавачаннямі ў адрас газеты „Ніва" кантрольная палата (NIK) пачала праверкі ў школах з вывучэннем беларускай мовы.*

*Гэтыя дзеянні польскіх уладаў успрымаюцца намі як форма запалохвання беларускай нацыянальнай меншасці з мэтай выключэння яе з культурнага, грамадскага і палітычнага жыцця Польшчы.*

*Выклікае занепакоенасць тое, што польскія ўлады паўтараюць практыку, якая існуе сёння ў Беларусі пры аўтарытарным рэжыме А. Лукашэнкі, арыентаваным на русіфікацыю беларускага грамадства і дыскрымінацыю беларускай культуры і адукацыі.*

*Мы ўпэўнены, што ў інтарэсах польскай дзяржавы развіваць традыцыі талерантнасці.*

*Рэспубліка Польшча з'яўляецца сябрам Еўрапейскага Звязу, ратыфікавала асноўныя пакты і канвенцыі ААН, тым самым узяла на сябе абавязацельствы па захаванні правоў нацыянальных меншасцяў.*

*У сувязі з гэтым Праваабарончы цэнтр „Вясна" заклікае кіраўніцтва краіны прыняць меры па спыненні праяваў дыскрымінацыі і забяспечыць выкананне міжнародных абавязацельстваў і стандартаў у галіне правоў чалавека ў дачыненні да беларускай нацыянальнай меншасці.*

***Старшыня Рады Праваабарончага цэнтру „Вясна" Алесь Бяляцкі***

# Забароненая мова



*Лёс нашай беларускай мовы бачыцца дзіўным. Яе ніхто фармальна не выкараняе, але ціхаліціцца яна ў непрыхільных ёй кліматах, якія вызначаюцца пару словамі: „Можна, але лепей не". Так у пасляcавецкай Рэспубліцы Беларусь. Зусім падобныя адносіны да беларушчыны і ў Рэчы Паспалітай, у якой чацвёртага лістапада Сейм прыняў — ампутаваўшы рукі-ногі — закон аб нацыянальных і этнічных меншасцях. Адзіная карысць ад яго такая, што юрыдычна прызнаецца існаванне ў Польшчы м.інш. беларускай меншасці. Але лепей, каб яе не было зусім!*

*Праект сучаснага закону— скажам — праваляўся ў сеймавых канцылярыях каля дванаццаці гадоў. Прапіхваў яго незабыўны Яцак Курань; хоць і салідарніцкі герой, аднак бяссільны пад ціскам польскага нацыяналізму. Талерантнасць палякаў аказалася вось самахвальствам. Яны папраўдзе вылітыя саветы ў нецярпімасці да нас, культуралагічныя імперыялісты; сашчурхоўваюць у беларускае гета, у ізаляцыю.*

*Пачулі мы ад Сейма наступнае: ва ўстановах тутэйшых дазваляецца гаварыць і пісаць выключна па-польску. Адразу прыходзіць у памяць вывешка ў царскіх магістратурах, калі не было яшчэ Польшчы: „Плевать на пол и говорить попольски строго воспрещено". Магчыма, аднак, смутна зразумець той страх перад палякамі, якіх знаходзілася ў межах Расійскай імперыі пад дваццаць мільёнаў. Але, чаго баіцца сучасная палітычная Варшава жменькі затурканых беларусаў? — пытаю ў Яна Марыі Ракіты з Грамадзянскай платформы як ініцыятара забароны меншасных моў у войтаўскіх гмінах. Хочацца сказаць яму — у яго руская жонка — словамі Антона Чэхава: „Уважаемый господин, как вам не стыдно!?"*

*Ракіта з Тускам былі ж у маім доме ў Крынках. Падаліся мне інтэлігентнымі ды культурнымі хлопцамі. Ажно тут, раптам, адзін з іх выскачыў на сеймавую арэну з такім агідным нумарам! Я лаўлю на вуха апраўданне: недапушчальна пагражае анямечанне Шлёнска, вось бяда! Мус баранiць польскасць. Але я, Яне Марыя, не веру вам. Праўда аб гэтых нацыяналістычных вашых падскоках цалкам іншая: трэба вам у будучыя выбары менавіта прыхіліць да сябе шавінізуючы электарат прыкасцельных выбаршчыкаў, от і ўвесь сакрэт. Зноў на беларускім гарбе едуць у рай! Робяць з нас заложнікаў дамінацыі шлёнскіх немцаў, дагаджаюць нашым коштам чорна-сутаннай правіцы, а нават чуліся ў тэлеперадачах пасольскія галасы, каб нашпарыць нас укаплех, у хвост і ў грыву, за антыпольскую палітыку... шаленаватага савецкага Лукашэнкі. У такой сітуацыі заставацца беларусам напраўду падобнае геройству, малоцяць ззаду і спераду.*

*Тая ж Грамадзянская платформа таго ж чацвёртага лістапада, калі Сейм забараняў калекацы па-беларуску з войтам, наладзіла пад савецкім консульствам у Беластоку шумны пікет з труною як сімвалам смерці дэмакратыі ў Беларусі. Дурны быў бы лукашэнкаўскі ўрад у Мінску, калі б не выкарыстаў свяжуткай польскай уставы на меншасці, адбрэхваючыся: „Вы, палякі, папракаеце нас у недэмакратычнасці, а самі — што робіце, іпакрыты!" І за тым воклічам пойдзе-паедзе: на Гродзеншчыне дзве сярэднія чыстапольскія школы, хоць аніводнай там беларускай, а ў мностве вясковых школ навучаюць польскай мове, не прымушаючы бацькоў шторaз дэклараваца, як вы гэта хочаце ўчыніць беларусам на Беласточчыне, ну, і чаго заеліся на „Ніву", бы вош на сабачы хвост?!*

*Калі так станецца, як я пішу, дык будзе гэта той унікальны выпадак мае згоды з саветамі ды іх енклівым правадыром. Бо, калі хто мае рацыю, трэба прызнаць яму яе, нягледзячы на антаганізм. Патрабуе таго дэмакратычнасць.*

*Хачу пры гэтым звярнуць увагу на гістарычную паўторнасць: як толькі пачынаюць лупіць беларусаў пад саветамі, адразу бяруць іх за морду і ў Польшчы! Польскія ўлады выкарыстоўваюць аказію, інакш гэта нельга зразумець. А пра палякаў, якія нам па-людску спрыяюць, я ўжо пісаў: даволі, што іх рукі ў каторага дацягнуцца да якойсьці ўлады, з месца пераўтвараюцца ў шавіняка; можа, хутчэй за ўсё таму, што шавіняцтва ёсць умовою, каб утрымацца на пасадзе ва ўладных структурах. Антыбеларускасць у нас і антыбеларускасць у саветаў ідэнтычныя. Наша начальства, нават з выгляду твару нагадвае мне чырвоных камісараў, іх сталінскія вусы, бародкі Леніна.*

*Што ўсё гэта значыць? Напэўна тое, што нічога бясплатна не сыплецца з неба, акрамя дажджу або снегу; за ўсё трэба ваяваць. Павучальная тут прымаўка: „Спадзяваўся дзед на мед і лёг спаць не еўшы". Паспадзяваліся мы на польскую дэмакратыю... Успомнілася выступленне беларускага пасла Тарашкевіча ў варшаўскім сейме паловы дваццатых гадоў, вельмі драматычнае, у якім ён выказаў расчараванне адносінамі да беларусаў. Каб добра дачуць яго драматызм, трэба ведаць, што Тарашкевіч быў „на ты" з шэрагам вядучых дзяржаўных мужоў тагачаснай Польшчы, сябруючы з імі ажно з гімназічных і студэнцкіх гадоў. І што з таго! І нічога!*

*Куды рэальней глядзелі заходнія ўкраінцы. Яны не спадзяваліся на гуманізм улады, а разгарнулі ўласны бізнес, настолькі ўдала, што сваім коштам утрымлівалі — увага! — 62 украінскія гімназіі, тысячы школ на вёсках, і нефармальны Украінскі Універсітэт у Львове. У той час, калі заходнім беларусам дзядзькі з санацыйнай адміністрацыі вылікўідавалі беларускія школы, урэшце разагналі па свеце нават каталіцкіх ксяндзоў-беларусаў.*

*Pańska łaska na pstrym koniu jeździ. Пакуль мы самі будзем слабыя, незгуртаваныя, датуль będą nami pomiatać. Życie jest brutalne, асабліва на недарэчным усходзе Еўропы.*

**Сакрат Яновіч**

# Хто адказны за экзамены?

*Яўген Сачко: У даведніку, выдадзеным Акруговай экзаменацыйнай камісіяй у Ломжы, няма інфармацыі пра экзамены па мовах нацыянальных меншасцей. У канцы лістапада будуць праведзены пробныя экзамены на атэстат сталасці арганізаваныя камісіяй у Ломжы і няма сярод іх экзаменаў па мовах нацыянальных меншасцей. Ёсць затое экзамены па партугальскай мове, ведах аб танцах, ці антычнай культуры. Не ведаю, ці збярэцца многа ахвотных, каб здаваць экзамены па гэтых прадметах. Затое па беларускай і літоўскай мовах будзе здаваць экзамены ў нашай акрузе некалькі соцень вучняў...*

Новыя экзамены на атэстат сталасці выклікаюць непакой сярод бацькоў вучняў. Раней маглі яны параіць сваім дзецям, як вучыцца да экзаменаў, што адкрываюць дарогу ў дарослае жыццё. Зараз не ведаюць што сказаць аб новай „матуры”. Многія вучні Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы з’яўляюцца аптымістамі і вераць, што новыя матуральныя экзамены хутчэй адкрыюць ім дарогу ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Дырэкцыя і настаўнікі беларускай мовы перажываюць за экзамены па беларускай мове. Акруговая экзаменацыйная камісія ў Ломжы пакінула настаўнікаў беларускай мовы без належнай дапамогі ў падрыхтоўцы да правядзення новых экзаменаў.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Многія вучні — аптымісты, але ці свядомыя сітуацыі з экзаменамі

### *Шматлікія аптымісты*

— Я думаю, што новыя экзамены на атэстат сталасці будуць лепшымі ад старых, бо ствараюць больш магчымасцей. Калі добра спраўімся з імі, можам адразу быць прынятымі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Раней трэба было здаваць экзамены асобна, каб стаць студэнтам, — кажа Іаанна Трафімюк. — Можа быць складана здаць экзамены па замежных мовах. Некаторыя вучні толькі ў ліцэі пачалі вучыцца замежным мовам, якія рашыліся здаваць на экзаменах. Я толькі няцэлыя тры гады буду вучыцца англійскай мове і пайду здаваць па ёй экзамены.

— Я думаю, што новая матура будзе больш аб’ектыўнай. Тыя настаўнікі, што будуць правяраць працы, не будуць ведаць вучняў, а толькі нумары работ, — гаворыць Магдаліна Шліфарская. З ёй згодны Павел Балтрамюк.

Аднак не ўсе гайнаўскія белліцэісты лічаць новыя экзамены лепшымі за старыя. Андрэй Ігнацюк мяркуе, што лепш было б здаваць традыцыйныя экзамены на атэстат сталасці, якія ўсім добравядомыя. Мае суразмоўцы гавораць, што ўскладняцца ўмовы здавання экзаменаў па беларускай і польскай мовах. Раней на напісанне творчай работы давалася вучням 5 гадзін. Зараз за 2 гадзіны трэба будзе напісаць творчую работу і адказаць на пытанні да тэксту. У час традыцыйных экзаменаў вучні, якія справіліся вельмі добра з пісьмовымі работамі, былі звольнены з вусных адказаў. Цяпер няма такой магчымасці. Белліцэісты кажуць, што на ўроках беларускай мовы пачалі паўтраць прысвоены раней матэрыял па літаратуры. Мае суразмоўцы ў большасці выбралі да вуснага экзамену па беларускай мове тэмы па этнаграфіі і зараз будуць збіраць патрэбны да экзамену матэрыял.

### *Пакінутыя сам-насам*

— Для настаўнікаў, якія рыхтуюць вучняў да новых экзаменаў на атэстат сталасці, арганізуюцца курсы і спатканні. Мы, настаўнікі беларускай мовы, пакінутыя сам-насам, — кажа настаўніца беларускай мовы Вольга Сянкевіч. Апошнім часам настаўнікі беларускай мовы не спатыкаліся ў справах правядзення экзаменаў на атэстат сталасці па беларускай мове.

— Непакоіць нас, што няма належнага зацікаўлення Акруговай экзаменацыйнай камісіі ў Ломжы справамі экзаменаў па беларускай мове. Дрэнна ўспрымаецца работа гэтай камісіі (па справах беларускай мовы — А. М.) на фоне таго, што рабілася яшчэ 3 ці 4 гады назад, калі матуральнымі экзаменамі па беларускай мове і іншых мовах нацыянальных меншасцей займалася Цэнтральная экзаменацыйная камісія ў Варшаве. Тады беларуская мова ставіліся нароўні з польскай мовай, — гаворыць дырэктар белліцэя Яўген Сачко. — У даведніку, выдадзеным Акруговай экзаменацыйнай камісіяй у Ломжы, няма інфармацыі пра экзамены па мовах нацыянальных меншасцей. У канцы лістапада будуць праведзены пробныя экзамены на атэстат сталасці арганізаваныя камісіяй у Ломжы і няма сярод іх экзаменаў па мовах нацыянальных меншасцей. Ёсць затое экзамены па партугальскай мове, ведах аб танцах, ці антычнай культуры. Не ведаю, ці збярэцца многа ахвотных, каб здаваць экзамены па гэтых прадметах. Затое па беларускай і літоўскай мовах будзе здаваць экзамены ў нашай акрузе некалькі соцень вучняў. Іншая справа, пра якую забылі ў акруговай камісіі, гэта падрыхтоўка „матуральных” фармуляраў для экзаменаў па беларускай і літоўскай мовах. Толькі з імі можна будзе выступаць з запатрабаваннем на экзаменацыйныя аркушы. Падрыхтаваны такія фармуляры для экзаменаў па ўкраінскай мове. Аднак цяжка сказаць, ці нехта будзе здаваць экзамены на атэстат сталасці па гэтай мове ў нашай акрузе. Дайшлі да нас неафіцыйныя весткі, што пытанні да экзаменаў на атэстат сталасці па беларускай мове будуць складацца ў Беларусі. Калі параўнаем праграмы навучання беларускай мовы ў Беларусі і ў нас, то бачым, што яны розняцца. У такім выпадку ў нашай моладзі могуць паявіцца праблемы на экзамене. Апошнім часам пануе цішыня ў справе беларускай мовы. Можа цішыня перад бурай.



Дырэктар Яўген Сачко

### *Настаўнікі хвалююцца за вучняў*

Вусныя ўнутраныя экзамены на атэстат сталасці распачнуцца 18 красавіка. Пісьмовыя экзамены будуць праводзіцца ў маі.

— Падрыхтоўка да новых экзаменаў на атэстат сталасці ідзе ўжо здаўна. Вучні з першага класа вучацца паводле новай праграмы і рыхтуюцца да новых экзаменаў. Настаўнікі ў час сваёй працы звяртаюць увагу на замацаванне сярод вучняў лагічнага мышлення, — паясняе дырэктар Яўген Сачко. — Думаю, што вучні, якія праз 2,5 гады салідна вучыліся, справяцца з матуральнымі экзаменамі. Тым, што не прыкладаліся да вучобы, напэўна не раз задрыжаць рукі ў час экзаменаў.

У час унутраных вусных экзаменаў вучні будуць выказвацца па беларускай мове паводле нядаўна выбраных тэм. Многія ліцэісты рашыліся рыхтаваць выказванне па фальклоры і этнаграфіі. Вучні будуць аналізаваць архітэктуру беларускай вёскі. Сярод тэм па літаратуры многія вучні выбралі прапановы наконт беларускай класікі. Найменш вучняў рашылася на тэмы па граматыцы.

— У час вуснай прэзентацыі вучні змогуць пакарыстацца падрыхтаванымі загадзя відэа- і аўдыёкасетамі. Можна будзе прэзентаваць фатаграфіі і рысункі. Аднак, самымі важнымі будуць уласныя выказванні ліцэістаў, — гаворыць настаўніца беларускай мовы Іаланта Грыгарук.

Пісьмовыя экзамены па беларускай мове будуць праводзіцца на асноўным і пашыраным узроўнях. Ліцэісты будуць адказваць на пытанні паводле прэзентаванага ім тэксту і пісаць творчую працу. Ацэньваць матуральныя работы павінны асобы, якія закончылі матуральныя экзаменацыйныя курсы. Хто будзе гэта рабіць, вырашыць камісія ў Ломжы.

— У час урокаў працуем з публіцыстычнымі тэкстамі. Раней многа такіх тэкстаў аналізавалі ў тыднёвіку „Ніва”, — кажа настаўніца Вольга Сянкевіч. — Я лічу, што новыя экзамены на атэстат сталасці па беларускай мове будуць лепшымі за традыцыйныя. Не трэба будзе ліцэістам завучваць на памяць матэрыял з падручнікаў. Вучні змогуць паказаць сваю мудрасць і выказацца канкрэтнымі ўмеласцямі. Тыя вучні, што рашацца здаваць экзамены па беларускай мове на пашыраным узроўні, павінны выказацца большай самастойнасцю мышлення, большай уражлівасцю і паглыбленым рознабаковым аналізам прапанаванага тэксту. Трэба будзе гэтым вучням адклікацца да гістарычных, філасофскіх і рэлігійных кантэкстаў. Аднак ёсць пагроза, што самыя здольныя вучні, якія любяць пісаць размашыста, не звернуць увагу на ўсе праблемы і тады ацэнка іх працы будзе ніжэйшай. Некаторыя вучні, якія пачалі вучыцца беларускай мове толькі з ліцэя, робяць яшчэ памылкі. Добра было б, каб усе вучні прынамсі ад гімназіі пачыналі вучыцца беларускай мове і тады будзе ім лягчэй вучыцца ў сярэдняй школе.

— Я лічу бесталкоўшчынай тое, што зрабілі трохгадовы ліцэй. Можна было б зрабіць пяцігадовую падставовую школу і трохгадовую гімназію. Цяпер атрымалася малавата часу, каб салідна падрыхтаваць вучняў да матуральных экзаменаў, — гаворыць намеснік дырэктара Аляксандр Лаўрыновіч. — Цяжка зараз сказаць якія экзамены лепшыя, новыя ці старыя. Кожнае новае выклікае боязь. Я апасаюся, што слабейшым вучням у час пісьмовых экзаменаў можа быць замала часу.

**Аляксей Мароз**

## Не тая меншасць

Не мае шчасця ў нашым парламенце праект закону аб нацыянальных меншасцях. Атрымоўваецца, што апрача пасла Яўгена Чыквіна, праўду кажучы, нікому з прадстаўнікоў улад на законе не залежыць. Значна больш сэрца і ўвагі розныя прамінентныя асобы ўдзяляюць сексуальным меншасцям. Ці нейкая частка іх непасрэдна зацікаўленая гэтым пытаннем? Бо як жа ж інакш разумець, напрыклад, выказванне намесніцы прэм'ер-міністра Ізабелы Яругі-Навацкай, якая ў радыёэфіры сказала больш-менш так: няважна, што 96% грамадства цікавіцца супрацьлеглым полам, бо ўсё-такі застаецца гэтыя 4%, якія... і так далей. Атрымоўваецца, што ў Польшчы лепей быць педэрастам, чым беларусам ці ўкраінцам, бо тады нашы ўлады клапатліва зоймуцца ўсімі патрэбамі такой меншасці. Ці ж гэта не дурдом?

**М. Ц.**

## А мы верылі

Закалот вакол закону аб этнічных і нацыянальных меншасцях паказаў, што пятнаццаць гадоў вялася над ім дыскусія ў парламенце, а да яго ўхвалення апазіцыя не дапускала. У выбарчай кампаніі многія палітыкі „аддавалі” пашану праваслаўным выбаршчыкам. Прыязджалі на Гайнаўшчыну і ўдзельнічалі ў сустрэчах на вёсках і ў цэрквах. Пасля забываліся аб абяцанках. А мы, як пакорнае цялятка, верылі аратарам. Зараз і СЛД, і Самаабарона адварочваюцца плячыма. У Еўрасаюзе інакш ставяцца да спраў нацыянальных меншасцей. І праўду пісаў Яўген Міpановіч, што палякі хочуць ці не хочуць, пад прэсінгам Еўрасаюза вымушаны будуць прыняць закон. А абвінавачванне „Нівы” ў фінансавым „злачынстве”? Недаразуменне, ці каварная палітыка? Безумоўна, што гэта другое.

**(ус)**

## Вяртанне санацыі

Так можна назваць сённяшнюю палітыку нашага польскага ўрада. Бяда, калі краінай правяць правыя, якія сення ў апазіцыі, але голас іх важны. І левыя мала ад іх іншыя і ў адну трубку яны трубяць. Не падабаецца ім і беларуская мова, і легальная газета „Ніва”, да выдаўцоў якой чапляюцца, выдумліваючы неверагодныя гісторыі толькі дзеля таго, каб пашкодзіць ёй і нашаму народу. Не ў смак ім, што мы яшчэ не забылі роднай мовы, якую яшчэ дзеці вывучаюць у школах, хаця так стараюцца ўсіх нас асімiляваць дазваляючы карыстацца ва ўстановах толькі польскай мовай.

**Мікалай Панфілюк**

*Спадару **Янку ЯКІМЮКУ**,*
*былому старшыні Праўлення*
*Аддзела БГКТ у Гайнаўцы,*
*члену беларускага і кафедральнага*
*царкоўнага хораў і Ягонай сям'і*
*словы шчырага спачування*
*з прычыны напаткаўшага Іх гора*
*— **смерці Маці і Бабулі** —*
*выказваюць сябры з Гайнаўкі*

# Няма чым хваліцца

*Яшчэ ў дзевяностых гадах некалькі маладых гаспадароў, якія рашыліся разгарнуць сельскагаспадарчую дзейнасць, паставілі новыя дамы. Апошнім часам змены ў вясковай архітэктуры амаль спыніліся...*



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Дом Іаланты і Міхала Кузыкаў збудаваны яшчэ ў дзевяностых гадах*

У Старым Беразове многа вялікіх мураваных дамоў, якія будаваліся ў сямідзесятых і васьмідзесятых гадах. Танныя крэдыты і рэальны прыбытак ад невялікіх гаспадарак давалі магчымасць хутка палепшыць умовы жыцця на вёсках. Мода на каляровыя драўляныя і жалезныя агароджы паявілася пазней. Яшчэ ў дзевяностых гадах некалькі маладых гаспадароў, якія рашыліся разгарнуць сельскагаспадарчую дзейнасць, паставілі новыя дамы. Апошнім часам змены ў вясковай архітэктуры амаль спыніліся. Некаторыя пенсіянеры падпраўляюць агароджы, а тыя, што рашыліся надалей гаспадарыць, прыстасоўваюць хлявы да еўрасаюзных патрабаванняў. Выкарыстоўваючы зробленыя грошы і крэдыты, сяляне інвестуюць у свае гаспадаркі.

— Гаспадарку ад бацькоў пераняў я ў 19 гадоў. Калісь лепш было гаспадарыць. Пасля з кожным годам крыху горшала. Апошнім часам цэны на сельскагаспадарчыя машыны павысіліся. Два гады таму купіў я італьянскі трактар, які зараз амаль у два разы даражэйшы. Дом паспеў яшчэ збудаваць у 1993 годзе. Цяпер не змог бы ўжо рэалізаваць такую інвестыцыю, — гаворыць Міхал Кузыка.

Спадарства Іаланта і Міхал Кузыкі яшчэ паспелі збудаваць вялікі мураваны дом насупраць бацькоўскага панадворка. Анна і Ян Трашчоткі адтэрмінавалі жыллёвыя інвестыцыі. Абедзве сям'і рашыліся выкарыстаць танныя крэдыты для маладых гаспадароў на інвестыцыі ў сельскагаспадарчую прадукцыю.

Неабходна інвеставаць у сельскагаспадарчую прадукцыю, каб дастасаваць яе да новых патрабаванняў. Міхал Кузыка павялічыў гадоўлю быдла і зараз у старых хлявах гадуе 21 карову, каля 20 штук цялят, ялавак і бычкоў. На 30 гектарах свайго і арандаванага поля рыхтуе толькі корм жывёле.

— Калі гаварыць пра прыбытак ад прадукцыі малака, то няма чым хваліцца. Ёсць у нас свой умяшчальнік на малако і таму атрымліваем 1 злоты і 5-6 грошаў за літр сыравіны. Сена трымаю ў фольгавых сіласах, а кукурузу рыхтую ў звычайных сіласах. Дадаткова карыстаюся сушаным сенам. Калі б кароў карміць традыцыйна, сенам, давалі б менш малака, — тлумачыць Міхал Кузыка. — Хлеў перарабіў я так, што каровы стаяць у адным радку. Аднак бачу, што ў наступных гадах трэба будзе перарабляць яго надалей, паколькі не будзе адпавядаць усім патрабаванням. Кошты вялікія, а толку з гэтага мала. Можа лепш было б збудаваць абору ад пачатку.

Раней у Старым Беразове можна было купіць гектар добрай зямлі за 4-5 тысяч злотых. Зараз цяжка нагаварыць пенсіянераў прадаць адданую ў арэнду зямлю. Жыхары гарадоў таксама не спяшаюцца пазбывацца бацькоўскіх надзелаў. Можна ўзяць лугі і ворыва ў арэнду і так робяць буйныя жывёлаводы. Калі ў будучыні схочуць яны атрымаць дапамогу з еўрасаюзнага бюджэту, ім трэба будзе даказаць, што на кожную штуку быдла выпадае адпаведная колькасць поля. Спадарства Анна і Ян Трашчоткі таксама арандуюць многа поля. Гаспадараць на 60 гектарах і гадуюць 20 кароў. Купілі ялавак, каб пабольшыць статак і таму мала збожжа застаецца на продаж.

— Каровы з ланцугамі стаяць на лугах. Блізка вёскі многа невялікіх участкаў і таму цяжка выдзеліць на лугах вялікія тэрыторыі і агарадзіць іх. Лягчэй было б гаспадарыць, каб была праведзена камасацыя палёў. Перарабляем хлеў згодна з новымі патрабаваннямі, — кажа Анна Трашчотка і вядзе паказаць мадэрнізаваны аб'ект. Каровы стаяць там прывязаныя да жалезных трубаў. Побач іх знаходзіцца корм. Мужчыны ўстаўляюць дзверы ў даільным адсеку. Непадалёк ад хлява і за клуняй ляжаць фольгавыя пакеты з сіласам.

— Трэба ўвесь час інвеставаць і нельга спыняцца. З часам трэба будзе будаваць вялікую абору. Апрача мадэрнізацыі будынкаў купілі мы новы трактар і сельскагаспадарчыя машыны. Яшчэ не атрымалі дапамогі з Еўрасаюза, але пакарысталіся танным крэдытам, — тлумачыць спадарыня Анна.

Па-суседску на 16 гектарах гаспадараць спадарства Вашчанкаў, якія гадуюць 10 кароў. Аднак не плануюць яны разбудоўваць сваёй гаспадаркі. Не купілі ўмяшчальніка і толькі часова прыстасавалі хлеў да еўрасаюзных патрабаванняў. Разам з іншымі жыхарамі Старога Беразова носяць малако ў супольны вясковы ўмяшчальнік.

— Нам плацяць па 90 грошаў за літр і таму прадукцыя малака малапрыбытковая. Можа прыстасуем гаспадарку да гадоўлі мяснога быдла. Калі даўжэй карміць цяля малаком, можна павысіць яго вагу нават да 300 кілаграмаў, — заяўляе Мікола Вашчанка і разважае адначасна ці не спыніць сельскагаспадарчай дзейнасці.

Хутчэй за ўсё толькі жменька маладых гаспадароў у Старым Беразове будзе займацца сельскай гаспадаркай. Старэйшыя гаспадары будуць вымушаны аддаць сваю зямлю ў арэнду або прадаць. Не атрымаюць яны дазволаў на аблясенне добрых зямель.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Спадарства Трашчоткі рашыліся мадэрнізаваць хлеў*

**Аляксей Мароз**

# Як быць з Беларуссю

Два тыдні пасля сумніўна ўспрынятых светам выбарах і рэферэндуме ў Беларусі, у Беластоку гасцяваў старшыня адной з найбольшых апазіцыйных партый — Беларускага народнага фронту — Вінцук Вячорка. Спадарожнічалі яму шэф міжнароднай камісіі Фронту Ігар Лялькоў і заснавальнік Саюза палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін.

Прыезд шэфа БНФ не адбыўся без праблем. На пагранпераходзе ў Баброўніках машына, якая прыехала за ім з Беластока, была падвергнута дакладнаму кантролю (яе разабралі). Працягвалася гэта дзве гадзіны.

— Гэта адзін са спосабаў запалохвання, такой дробнай помсты ўлад на дэмакратычную апазіцыю, — каменціраваў здарэнне старшыня БНФ.

Вячорка і Лялькоў сустрэліся са студэнтамі Вышэйшай школы публічнай адміністрацыі, якой рэктарам з'яўляецца падляшская еўрадэпутатка праф. Барбара Кудрыцкая. Разам з Ігарам Ляльковым прыняў ён удзел у мітынгу перад Генеральным консульствам РБ у Беластоку, сарганізаваным пад лозунгам „Solidarni z Białorusią". Удзельнічала ў ім пару дзесяткаў, галоўным чынам маладых людзей з беластоцкіх вышэйшых вучэльняў. Прайшлі яны праз горад са знічамі ды труной, якая сімвалізавала трагічна загінуўшую 17 кастрычніка дэмакратыю. Праф. Кудрыцкая і шэф гарадскіх структур Грамадзянскай платформы (PO) прабавалі перадаць прадстаўніку консульства петыцыю, асуджаючую парушанне правоў чалавека на Беларусі. Ніхто, аднак, з працаўнікоў консульства да іх не выйшаў. Раней у час прэс-канферэнцыі Вінцук Вячорка гаварыў:

— Зараз, пасля ўваходу Польшчы ў ЕС, стратэгічнае мышленне ў адносінах да Беларусі зарысоўваецца. Неабходная вельмі вострая, эфектыўная ізаляцыя кіруючай піраміды, разам з нестваранне бар'ер у адносінах да грамадства.

Праф. Кудрыцкая падтаквала:

— Ёсць выразная патрэба ў адназначнай палітыцы ў адносінах да Беларусі.

Усе пагаджаліся наконт неабходнасці вяртання радыёстанцыі, якая вяшчала б на Беларусь на ўзор маўклівага цяпер Радыё „Рацыя". Тадэвуш Гавін казаў:

— Радыё, якое б вяшчала свабодную думку, патрэбнае не толькі беларусам, але і палякам у Беларусі. Палякі, там пражываючыя, змогуць карыстацца поўнасцю правоў і свабоды, калі беларусы будуць таксама імі карыстацца.

Найважнейшай часткай візіту Вінцука Вячоркі, Ігара Лялькова і Тадэвуша Гавіна ў Беластоку была панельная сустрэча ў Палацы шлюбаў. Абмяркоўвалася, як Польшча, а тут і Падляшша, можа дапамагчы Беларусі. Дарыюш Данілюк з Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь разважаў, ці не варта было б падтрымаць звонку якуюсьці з беларускіх апазіцыйных газет іператварыць яе ў шматтыражны часопіс. Яўген Янчук, шэф Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, адзінай беларускай партыі ў Польшчы тлумачыў:



Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

*Студэнты з'явіліся таксама з бел-чырвона-белымі сцягамі*

— Беларуская меншасць у Польшчы часта не разумее працэсаў, якія праходзяць у Беларусі.

Дырэктар беларускага ліцэя ў Гайнаўцы Яўген Сачко:

— Калі не наступіць адраджэнне беларускай мовы, цяжка будзе штонебудзь зрабіць у Беларусі, накіраваць яе к Захаду.

Міхась Андрасюк, лідэр Беларускага самаўрадавага форуму, успамінаючы трансгранічнае супрацоўніцтва самаўрадаў пераконваў:

— Найлепш раз паказаць, чым шмат разоў гаварыць.

Сакрат Яновіч:

— Справа ў дзейнасці ненавязлівай, у якой будзе больш рацыі, чым эмоцый. Калі беларуская меншасць тут выкарыстоўваецца нашай уладай, бо гэта ж і наша ўлада, як „хлопец для біцця", дык будзе яна выкарыстоўвацца, для прапагандысцкіх мэт, другім бокам.

На думку вядомага ва ўсім свеце пісьменніка з Крынак, трэба ці не ў Беластоку стварыць беларускі універсітэт, на аснове дзейнічаючага ўжо беларускага навуковага, літаратурнага і журналісцкага асяроддзяў. І падкрэсліў:

— Пакуль Беларусь не стане беларускай, няма што гаварыць аб дэмакратыі. Русіфікацыя — катастрофа, бо адмяняе чалавечую свядомасць. Расія Еўропай ніколі не будзе, такая аграмадзіна праглынула б Еўропу.

Сакрат Яновіч прапанаваў, каб фундаваць у Польшчы стыпендыі выбітным грамадзянам Беларусі.



Вінцук Вячорка (на здымку):

— Патрэбны крок, каб ліквідаваць у Беларусі пачуццё страху і недаінфармаванасці. Беларусь стаіць перад цывілізацыйным выбарам і недахопам кадраў, якія б запоўнілі прабел пасля ліквідацыі вертыкальнай дыктатуры. Неабходна павялічыць сродкі на салідарнасць з праследаванымі. Беларуская меншасць тут — натуральны памост, так, як польская меншасць у Беларусі — другая частка таго памосту.

Тадэвуш Гавін:

— Дзяржава, інтэграваная з Еўропай, не можа баяцца нацыянальных меншасцей. Зайздрошчу тутэйшым беларусам, што маюць навукоўцаў, літаратараў і беларускага Гедройца ў Крынках. Няма большай памылкі чым думка, што калі польская меншасць у Беларусі будзе ціха, то штосьці дастанецца ёй ад рэжыму. Калі цяжка беларусам, дык таксама і палякам.

Ігар Лялькоў падкрэсліў неабходнасць пашырэння г.зв. інфармацыйнай прасторы; не толькі ствараючы радыёстанцыі і — ідэальна — тэлестанцыі, але выдаючы за мяжой газеты. Заўважыў ён таксама неабходнасць заснавання цэнтраў еўрапейскай інфармацыі:

— Большасць грамадства ў Беларусі выказвае праеўрапейскую пазіцыю, бо Еўропа — гэта штосьці заможнае.

Палічыў ён неабходнай дапамогу ў адукаванні кадраў у галіне адміністрацыі і публічнай гаспадаркі, міжнародных зносін, дыпламатыі, самакіравання і вайсковых спраў.

Шэф Беларускага саюза ў РП Яўген Вапа:

— Трэба перш за ўсё адукаваць падляшцаў у тым, што за суседзяў маем беларусаў, а не расіян, бо гэта не „рускія". У адносінах да Беларусі гучаць даклярацыі, але не хапае іх перакладу на паслядоўныя дзеянні.

Роберт Тышкевіч (PO):

— Польшча за апошнія гады не вяла паслядоўнай усходняй палітыкі, а ў адносінах да Беларусі ўвогуле няма ў ёй лагічнасці. Трэба адказаць на пытанне, ці беларуская меншасць у Польшчы гэта элемент усходняй палітыкі. Тут, на Падляшшы, перад намі стаіць задача, каб аб Беларусі не было ціха, асабліва тады, калі праводзяцца там арышты і прымяняюцца іншыя формы рэпрэсій. Патрэбныя тут структуры салідарнасці з праследаванымі.

**Мацей Халадоўскі**

## *Аднаўленне вёскі*

*Рада Бельскага павета ў Плане мясцовага развіцця на 2004-2006 гг. прадбачыла шмат задач для здзяйснення на вясковай тэрыторыі. На агульны лік 61 255 жыхароў павета (у палове мінулага года), 58,6% пражывае ў вёсках. Сельская гаспадарка — на арэале ста тысяч гектараў (у гэтым ліку 59,5% ворнай зямлі і 40,3% зялёных угоддзяў) — дамінуе ў павеце. Працуе тут 14 117 звышгектарных — у сярэднім дзесяцігектарных — гаспадарак. У выніку дэмаграфічных працэсаў жыхары вёсак старэюць ды выязджаюць у гарады. Гаспадары ўзростам да 30 гадоў складаюць 7,5%, ад 31 да 40 — 17,7%, 41-60 — 39% і звыш шасцідзесяці — 35,8%. Вялікай праблемай бельскіх вёсак з'яўляецца беспрацоўе — у пачатку 2001 года было там зарэгістраваных 1 689 беспрацоўных, з ліку якіх 1 113 чалавек мелі свае гаспадаркі.*

*Вёскі Бельскага павета найчасцей забудаваны двума радамі двароў уздоўж адной дарогі. Асноўным недахопам гэткага размяшчэння з'яўляецца немагчымасць разбудовы гаспадарчых будынкаў у рамках адной сядзібы.*

*Развіццё вёсак абмяжоўвае і ўстарэлая дарожная інфраструктура. Ледзь палова гмінных дарог мае цвёрды насціл, большасць іх патрабуе мадэрнізацыі і рамонтаў, а стан іх горшае ў выніку прымянення цяжкіх сельскагаспадарчых і транспартных машын.*

*У апошні час наступіла паляпшэнне тэлефоннай сувязі дзякуючы напружанай тэлефанізацыі вёсак пры падтрымцы дакцэсійных фондаў і пашырэнню мабільнай сувязі. Усё большай праблемай становіцца дастаўка вады, галоўным чынам у сялян, якія карыстаюцца ўласнымі ваданосьнымі крыніцамі.*

*На вясковых тэрыторыях большасць сцёкаў выходзіць непасрэдна ў прыроднае асяроддзе, а сітуацыю пагоршвае таксама ўзбуйненне вытворчасці і яе скапленне на малых абшарах некалькіх больш дынамічных вёсак.*

*Згодна Плану мясцовага развіцця, прадбачаныя на вясковых абшарах задачы ставяць мэтай прыстасаванне ўмоў жыцця насельніцтва да цывілізацыйных стандартаў эканамічнага, адукацыйнага, культурнага і грамадскага характару ды мабілізацыю сялян на супольныя пачыны дзеля паправы варункаў і якасці жыцця на вёсцы.*

*Паправу сітуацыі на вясковых абшарах мае забяспечыць два галоўныя напрамкі дзеяння:*

*1. Нарыхтоўка — з удзелам вясковага насельніцтва — праграм аднаўлення вёсак з захаваннем і аховай культурнай і прыроднай спадчыны.*

*2. Выкананне задач у галінах:*

*— рамонт, пабудова або прыстасаванне аб'ектаў культурнага прызначэння: вясковых святліц, бібліятэк, храмаў;*

*— рамонт, пабудова і аснашчэнне дзіцячых і спартыўных пляцовак, гімнастычных залаў пры школах, веласіпедных дарожак і пешых маршрутаў для шырокага карыстання;*

*— захаванне мясцовых традыцый, у тым ліку і традыцыйнай вытворчасці;*

*— устройства або пабудову элементаў турыстычнай і адпачынковай інфраструктуры, у тым ліку сістэм зрокавай інфармацыі;*

*— рамонты памятных аб'ектаў публічнага прызначэння і мясцовых гістарычных помнікаў;*

*— архітэктурны, рэстўратарскі і тэхнічны нагляд за праводжанымі ў рамках праграмы мерапрыемствамі.*

**Міхал Мінцэвіч**



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі




Фота АЛЯКСАНДРА МАКСІМЮКА

*Да нас завіталі госці з Бабік*

# *Падарунак з сэрцам!*

Сонечным цёплым панядзелкам да нас завіталі госці — дзеці і настаўнікі са школы ў Бабіках, што на Сакольшчыне. Вясёлая, радасная кампанія!

У руках дзяўчынак красаваліся восеньскія букеты каляровага лістоўя клёнаў, сабраныя ў парку „Звярынец”.

Раней нашы сябры пабывалі ў Інстытуце біялогіі, дзе пазнаёміліся з прыродазнаўчай галерэяй. Адтуль... як жа ж іначай — завіталі і ў беластоцкі заапарк.

— Бачылі мядзведзя, ваўкоў, лам, — пералічваюць наймалодшыя з жывым вобразам пабачанага ў сваіх вачанятах.

Экскурсія, у асноўным, была арганізавана найстарэйшым класам. Разам з імі прыехалі дзеці з малодшых класаў — словам, прыехалі ўсе, хто з гэтага года ходзіць на беларускую мову. Паездка — узнагарода, якую прыдумалі навучэнцам беларускай мовы іх настаўнікі.

Цікава, што пераступіўшы парог нашай рэдакцыі, дзеці смела размаўлялі па-беларуску. Дзяўчынкі нават заспявалі і затанчылі нам у стылі гіп-гоп верш Якуба Коласа „Музыкі”. Падарылі таксама свой каляровы букет і цудоўны малюнак — вялікае сэрца з ружамі і бел-чырвона-белым сцяжком.

Цяпер падарункі бабіцкіх школьнікаў у нас на ганаровым месцы — пад іх сэрцам чамусьці ўсе любяць фатаграфавацца.

Мы таксама — на добры ўспамін — зрабілі памятны здымак ля рэдакцыі „Нівы”. Здымак, можна сказаць — ужо гістарычны, бо зараз наш будынак праходзіць грунтоўны рамонт і будзе знадворку цалкам іншы. ***Зорка***

# *Дапамажыце бяздомнай жывёле!*

Два гады таму ў нашым класе ўзнікла думка, каб дапамагчы сабакам і катам, якія зімуюць у прытулку. На працягу двух тыдняў лістапада мы збіралі грошы. Вынік атрымаўся вельмі задавальняючы — мы сабралі 80 злотых. За гэта мы купілі ежу сабакам і катам ды завезлі яе ў прытулак.



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Акцыю мы паўтарылі і ў гэтым годзе. Праўду кажучы, мы засумавалі за атмасферай, якая панавала два гады таму, дык зноў наладзілі зборку грошай. Мы развесілі па ўсёй школе вялікія плакаты, якія заахвочвалі несці дапамогу бедным сабачкам ды коцікам. 26 кастрычніка мы прайшліся па кабінетах і сабралі 30 злотых. Цягам наступных дзён не было горш — агулам мы сабралі 130 злотых.

Цікава, найбольш шчодрымі ахвяравальнікамі былі дзеці з нулявога класа.

Неўзабаве мы паедзем у прытулак з падарункамі ад дзяцей. Нашы чатырохногія сябры атрымаюць шмат смачнай ежы.

Акцыю прымяркоўваем пад „Мікалайкі” — свята, на якое дзеці атрымоўваюць падарункі. Хай і бедная хатняя жывёла верыць у добрага Дзеда Мароза!

***(нак-с), VI „а” кл. ПШ н-р 4 у Беластоку***

# Боцікі паўночныя

Прыгожая сіняя кветачка... Здавалася б, такая пяшчотная, такая ласкавая... А ў ёй цячэ страшная атрута — аканіт. Ці можа прыгажосць быць згубнай? Не спяшайся, не давай адказу, пакуль не паслухаеш гісторыю, якая здарылася ў нашых краях шмат гадоў таму.

Прывёз мясцовы пан сабе жонку. Казалі — з далёкай халоднай краіны, дзе такая лютая зіма, што людзі не старэюць, бо кроў у іх замарожаная. Нездарма ж у пані была такая белая-белая гладкая скура з ледзь прыкметным румянкам, такія светлыя валасы, укладзеныя ў высокую прычоску, такія сінія-сінія вочы і ножкі маленькія, як лебядзіная дзюба, абутыя ў зграбныя чаравічкі на высокіх абцасах.

Вядома, у нашых, беларускіх дзяўчат таксама светлыя валасы і сінія вочы, але прыгажосць пані была зусім не такой, як у нашых красунь. Нават пайшла пагалоска, што пані — несапраўдная, якаясь парцалянавая. Твар яе здаваўся застылым. Не адбіваліся на ім ані гнеў, ані радасць, ані сум. І голас пані заўсёды гучэў аднолькава роўна і гучна... Аж трэсла бедных прыгонных дзяўчат ад тае роўнасці — лепей бы пані крычала на іх. Як пачуюць дробны стук яе абцасікаў — ледзь не млеюць ад жаху.

Гаварыла пані толькі на сваёй дзіўнай мове, а выконваць яе загады належала дакладна. Іначай — пакаранне. Добра, калі побач ахмістрыня-немка, перакладзе. А то зразумей, куды гэта пані пальцам тыцкае, і што належыць з гэтым зрабіць.

Праўда, зрабіць трэба было найчасцей адно — вымыць, вычысціць, адшкрэбці. Пані любіла чысціню і парадак гэтак, як ніхто ў нашых краях не бачыў. Мясцовыя звычаі здаваліся ёй дзікунскімі, а тутэйшыя людзі — страшэннымі неахайнікамі. І, вядома, пані лічыла абавязкам гэтых дзікуноў бязлітасна перавыхоўваць. Нават траву каля сядзібы пані загадала падстрыгчы менавіта паводле той меркі, якую яна дала. І каб ні адна сцяблінка не насмелілася вытыркнуцца! Прыслуга апранула белыя фартушкі і каптурыкі, на якіх нельга было паказаць і ценю бруду. Старыя кілімы, розная дубовая мэбля, карціны ў цяжкіх, пацямнелых ад часу рамках адправіліся ў адрыну, а ў доме запанавалі светлыя колеры і чысціня... Такая, што выпадковаму госцю страшна было крок ступіць па бліскучым, як жоўты лёд, паркеце. А перш чым сесці на бялюткае крэсла з залатымі кветкамі, хацелася пасцяліць насоўку.

Тым не менш госці ў доме збіраліся часта. І смешна было глядзець, як паны адзін перад адным стараюцца выклікаць усмешку на вуснах прыўкраснай гаспадыні дома. Хто рамансы пяе, хто на фартэпіяна грае, хто дасціпнічае... А што карысці з тае ўсмешкі? Пані нават усміхацца як след не ўмела, скрывіць ветліва вусны — і ўсё. А пан, яе муж, смяецца: „Мая Караліна — сапраўдная каралева. Яна вышэй за ўсялякія штукарствы”.

Толькі ільдзяная гэта была каралева.

(працяг будзе)

*Людміла* **Рублеўская**





Дзяўчаткі з ПШ н-р 6 у Гайнаўцы

Час рыцараў

## На службе ў рыцара

Якую школу трэба закончыць, каб стаць рыцарам?

Першая рэч: трэба нарадзіцца ў рыцарскай сям'і. Ужо ў сем гадоў хлопцы пакідалі бацькоў і пасяляліся ў чужым замку. Звычайна бацькі аддавалі сыноў пад апеку багатых суседзяў, каб тыя займаліся іх выхаваннем.

Спачатку малы паж прыслугоўваў ля стала і дапамагаў гаспадыні дому, якая замяняла яму маці. Хлопец вучыўся дворскіх звычаяў і этыкета, каб пасля ўмела паводзіць сябе ў высакароднай кампаніі. Адной з задач малога кандыдата ў рыцары быў таксама догляд коней.

Калі хлопец канчаў 14 гадоў, пераходзіў на службу ў рыцара. Разам са сваім панам ездзіў на вайну, насіў яго зброю, а калі была такая патрэба, ставаў у рады ды змагаўся як сапраўдны ваяр.

Каб лоўка карыстацца зброяй і змагацца з непрыяцелем, кандыдат у рыцары ўвесь вольны час займаўся трэніроўкай. Пад вокам вопытнага рыцара абучаў наравістых аграмакаў. Або рабіў г.зв. атаку на саракіна. Карацей, у поўным галопе ён мецiў штыхом у рухомае чучала. Гэтая задача патрабавала выключнай канцэнтрацыі і здольнасці. Пасля меткай атакі наш яздок павінен чым хутчэй сачыць за рухам „ворага”, бо „раненае” чучала кружылася і загнаным у яго штыхом магло параніць нашага ваяра.

(працяг будзе)

**Зорка**





Настаўніца Аліна Ваўранюк

## Конкурс з „Рыцарам”!

Дарагія сябры!

Многія з вас пражываюць у гарадах і мястэчках, у якіх старажытнае паходжанне і слаўная гісторыя. У сувязі з публікацыяй „Час рыцараў” мы прапануем вашай увазе конкурс.

Трэба назваць прынамсі адзін горад або мястэчка Падляшша, у гербе якіх менавіта выява РЫЦАРА.

У выніку жараб'ёўкі правільных адказаў шчасліўцы атрымаюць узнагароды: кампакт-дыскі з беларускай рок-музыкай, між іншым, гурту „Н.Р.М.”.

Вашых адказаў чакаем да 6 снежня 2004 года.

**Зорка**

## Польска-беларуская крыжаванка № 47

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.





**Адказ на крыжаванку н-р 43:** Узгорак, каштан, прымаразкі, кут, руда, абутак, лук, Ала, атара, таўр, спадар, ды. Нос, шапка, труба, тытул, грам, тата, нара, ар, рукаў, абрад, зала, як, ура, галінка.

Узнагароды — набор каляровых аўтаручак — выйгралі: **Якуб Сухадола** і **Юліта Скепка** з Нараўкі, **Эля Шарэйка, Паўліна Паўлючук** і **Дарота Цімашук** з Дубін, **Павал Іванюк** з Бельска-Падляшскага, **Іаанна Казёл, Кася Хлябіч** і **Лукаш Зіневіч** з Гарадка, **Аня Савіцкая** са Свінароўя. Віншуем!

## *Вершы Віктара Шведа*

### *Адкуль узяўся слон?*

*У заапарку быў Лявон —*
*Ачараваў яго там слон.*
*— Вось аграмадзіна якая,*
*Паняцця я аб ёй не маю!*

*І запытаў матулю ён:*
*— Скажы, адкуль узяўся слон?*
*Хіба не скажаш мне, мамуся,*
*Што і слана прыносіць бусел?*

### *Дзе ты нарадзіўся?*

*— Нарадзіўся дзе ты? —*
*Хлопца запыталі.*
*А Янка на гэта:*
*— Вядома, у шпіталі.*

*Дзеці са здзіўленнем:*
*— Праўду ты гаворыш?*
*Пасля нараджэння*
*Быў адразу хворы?*

## Васілёчак — сіні цвет

Музыка і словы Мікалая Мяжэннага

*Колькі песень шчырых*
*Складзена ў народзе*
*Аб галубовым васілёчку,*
*І купальскіх ночах.*
*Прыпеў:*
*Васілёчак — сіні цвет,*
*Любы мой, прыгожы.*
*І чаму ты, дарагі,*
*Мяне растрывожыў?*

*Расцвілі ўжо васілёчкі*
*Ў чэрвені у жыце.*
*Прыйшла Галя на спатканне,*
*Да мілага Віці.*
*Прыпеў.*
*Пачалі звіваць вянок*
*Найпрыгожы ў свеце.*
*Ад такога харастства*
*Замірае сэрца.*
*Прыпеў.*
*На дваіх адзін вянок*
*Будзе ўсё як трэба.*
*Калі ў лад пяе душа,*
*Іншага не трэба.*
*Прыпеў.*
*Васілёчак — сіні цвет,*
*Любы мой, прыгожы.*
*Ты дзве долі аб'яднаў,*
*На шырокім полі.*

## Іграй, звонкая гармонь

Музыка і словы Мікалая Мяжэннага

*Як збяруцца „Васілёчкі"*
*На канцэрт ці пробу*
*Заіграюць, заспяваюць*
*Весела народу.*
*Прыпеў:*
*Іграй звонкая гармонь,*
*Весялі народ,*
*Вось які цудоўны*
*У нас карагод.*

*Колькі далі мы канцэртаў,*
*Нават не лічылі*
*І заўсёды „брава" „біс"*
*З намі разам былі.*
*Прыпеў.*
*Хай ляціць бадзёра песня,*
*Мы ўсе Вас вітаем,*
*Многа шчасця і здароўя*
*Шчыра Вам жадаем!*

# „Васілёчкам" — сорак



У лістападзе 1964 года старшыня Бельскага аддзела БГКТ Уладзімір Раеўскі і сакратар аддзела Ян Шурбак распрацавалі план сарганізавання беларускага хору пры Бельскім доме культуры. На першую арганізацыйную рэпетыцыю прыйшлі чатыры жанчыны і адзін мужчына, на другую — трошкі больш на чале з будучым дырыжорам Аляксандрам Лукашуком. Ён аказаўся цудоўным музыкантам, чалавекам вельмі артыстычнай натуры, што для хору мела вялікае значэнне. Да таго згадзіўся ён кіраваць хорам бясплатна.

Першы канцэрт калектыў даў у Райску. А месцам першага фэсту была Орля. Бельскія харысты карысталіся рознымі відамі транспарту. Пачаткова найчасцей былі гэта грузавікі знятыя ў мясцовых прадпрыемствах.

Памятнай датай стала 8 сакавіка 1973 года — Дзень жанчын, калі харысткі атрымалі кветкі і праспявалі, між іншым, песню Міколы Куліковіча „Васілёчкі", якая стала візітнай карткай і назвай калектыву. Гэтая песня дала хору не толькі пуцёўку ў жыццё, але прыдала таксама крылы для палёту ў песеннае мастацтва.

Пасля пераезду Аляксандра Лукашука ў Гайнаўку хорам коратка кіраваў Сцяпан Копа. Пасля „Васілёчкамі" дырыжыраваў Юры Шурбак. Харысты запамяталі яго як чалавека, які працы з хорам аддаваў усю душу. Чарговым дырыжорам быў Міхал Артышэвіч, які стараўся надаць хору атмасферу цяпла, радасці, нястомнай прагі творчай дасканаласці. У 1970-1990 гадах хор узначальваў Сяргей Лукашук — выдатны педагог і музыкант. Пад яго апекай „Васілёчкі" набылі вядомасць у краіне і за мяжой. Выступалі яны з канцэртамі ў Польшчы і на Беларусі. У Мінску далі больш чым гадзінны канцэрт на тэлебачанні. Сяргея Лукашука ў сваю чаргу паспяхова замяніла Аліна Негярэвіч, затым нядоўга хорам кіраваў Уладзімір Сахарчук. Яму на змену прыйшоў Мікалай Мяжэнны з Гродна. У тым часе хор хутка здабывае папулярнасць, дае шмат канцэртаў, удзельнічае ў сустрэчах арганізаваных для калектываў нацыянальных меншасцей у Сейнах, Дабрыдзені, Варшаве і Урсусе, а таксама ў мерапрыемствах ладжаных Галоўным праўленнем БГКТ у Беластоку і ўладамі горада Бельска.

Цяпер хорам „Васілёчкі" кіруе Ніна Бялецкая — жыццярадасны чалавек, які з аптымізмам глядзіць у будучыню.

— У нас няма выпадковых людзей, — кажа яна. — Члены хору працуюць вечарамі і як трэба — у выхадныя дні. У нас не застаецца для сям'і столькі часу, колькі хацелася б. І дома, на жаль, з-за гэтага іншым разам бываюць сваркі, рэўнасць. Але мы пераадольваем цяжкасці. Я вельмі задаволена працай з хорам і тым, што харысты прыналежнасць да „Васілёчкаў" лічаць самай значнай і важнай справай.

Я ўпершыню з хорам „Васілёчкі" пазнаёміўся на песенным базары ў Бандарах. Не прапусціў я чарговую нагоду сустрэчы з хорам на „Сяброўскай бяседзе" ў Гарадку. Там я адчуў непаўторную атмасферу мерапрыемства, калі людзі становяцца больш раднымі і шчаслівымі слухаючы суквецце талентаў „Васілёчкаў" і іншых калектываў.

— За сорак гадоў існавання мы выступілі з 798 канцэртамі, — працягвае аповед Ніна Бялецкая. — Усюды нас вельмі добра прымалі. Можна сказаць, што мы заваявалі сэрцы слухачоў. Нашы песні ўспрымаліся імі як глыток роднай крынічнай вады і мы адчувалі, што ў песнях прывезлі ім зарад беларускай энергіі.

Цяпер у „Васілёчках" спявае 14 жанчын і 9 мужчын.

**Віктар Бура**

# Мастацкія выстаўкі



У залах Гарнізоннага клуба ў Беластоку ў кастрычніку 2004 года адбылося адкрыццё дзвюх мастацкіх выстаў: прац вядомага мастака Пятра Гагана (на здымку з гітарай) з Гайнаўкі і дасягненняў мясцовага мастацкага гуртка, які спецыялізуецца ў так званых „бацікаў".

Адкрываючы выстаўку карцін Пятра Гагана кіраўнік Гарнізоннага клуба Марэк Ніжынскі сцвердзіў між іншым: „Ужо персанальны пенсіянер, салдат-мастак Пётр Гаган вядомы ў Варшаўскай ваеннай акрузе, аднак у нас у Беластоку экспануецца ўпершыню. Упэўнены я ў тым, што зроблены пачатак паспрыяе пастаяннаму супрацоўніцтву".

Пётр Гаган дзякуючы кіраўніку клуба за экспазіцыю, якая будзе працягвацца да канца лістапада, падкрэсліў, што сваю выстаўку прысвячае Кастусю Майсеню, славутаму будаўніку Беларускага музея ў Гайнаўцы. У залах гэтага музея ў 2002 годзе адбылася абшырная персанальная выстаўка прац Пятра Гагана з выпадку пяцідзесяцігоддзя з дня яго нараджэння. Прадстаўленыя на выстаўцы працы Пятра Гагана — гэта плён яго замежных і краёвых паездак.

У цэнтральным месцы выстаўкі апынулася вялікіх памераў ікона Ісуса Хрыста, які натхняе мастака да творчай працы. Цешыць зрок наведвальнікаў выстаўкі Ісакіеўскі сабор — шэдэўр сакральнай архітэктуры XIX стагоддзя ў Санкт-Пецярбургу. Чаргова знаёмімся з выявай Сабора Святой Тройцы ў старажытным, з XII стагоддзя рускім горадзе Кастраме, што на левым беразе Волгі. Мастак пабываў чаргова на маляўнічым Крыме і адлюстраваў берагі Чорнага мора ў Ялце і Феадосіі.

Бачым таксама старажытны замак у Троках пад Вільняй. З вядомым мастацкім калектывам „Чарамшына" мастак пабываў у Парыжы і ў французскай Брэтані, аб чым сведчыць партрэт маладой брэтанкі ў прыгожым нацыянальным касцюме.

Вярнуўшыся з-за мяжы мастак не можа ўседзець на месцы. Бачым яго ў Сувалках, дзе ўваскрашае Кляштар камедулаў над возерам Вігры. На Татарскім шляху адлюстраваны мастаком мячэці ў Крушынянах і Багоніках. Святым сэрцу мастака з'яўляецца комплекс Супрасльскага манастыра, дзе ён пабываў на пленэры і адлюстраваў на карціне рэканструяваную абаронную царкву Дабравешчання Прасвятой Дзевы Марыі. Прадстаўленая на карціне мастака засохлая ўжо сасна пачынае абрастаць у легенды. Ходзяць чуткі, што быццам бы адскочыла ад ствала сасны сякера лесаруба, які намерваўся яе ссячы.

Ну і як жа з паэтычнай душою мастак можа абысціся без маляўнічых краявідаў легендарнай Белавежскай пушчы! Яны абавязкова прадстаўлены на выстаўцы.

І мяне ў хаце натхняюць да творчай працы сімвалічныя беларускія васількі-валошкі, якія пастаянна квітнеюць на карціне, што вісіць над маім ложкам, падораныя мне мастаком Пятром Гаганам.

У суседнім зале Гарнізоннага клуба дэманструецца выстаўка „бацікаў", мастацкіх прац маладых жанчын: Дануты Войцік, Наталлі Войцік, Жанэты Кухарскай, Ірміны Кухарскай, Евы Кэмпы і Асі Сахарчук. Цешаць вока наведвальнікаў выстаўкі асабліва сімпатычныя коцікі на карцінах Ірміны Кухарскай. Зацікаўленых тэхнікай выканання таго роду мастацкіх прац кіруем да іх выканаўцаў, якія дзяжураць на выстаўцы.

**Віктар Швед**

# Пецюкевіч у Торуні



*Міраслава Штольберг-Быблюк — дачка Мар'яна Пецюкевіча*

13 верасня прайшло 100 гадоў ад часу, калі ў вёсцы Цяцеркі на Браслаўшчыне нарадзіўся Мар'ян Пецюкевіч (1904-1983), беларускі дзеяч і этнограф, які ўсё жыццё прысвяціў свайму народу. Пасля прыезду ў Польшчу ў 1956 годзе працаваў у Этнаграфічным музеі ў Торуні. Ад гэтага часу быў моцна звязаны з беларускім асяроддзем Беласточчыны і Беласточчынай. „Беласточчыне ўсяцэла аддаю сваё сэрца і веды”, — сказаў Мацею Канапацкаму ў размове для „Нівы” ў 1962 годзе. А ў прыватнай карэспандэнцыі напісаў яму: „Я, як заўсёды, шчыра шукаў магчымасцей да майго асабістага ўдзелу ў грамадскім жыцці нашага грамадзянства, пражываючага ў межах Народнай Польшчы; жадаў заўсёды працаваць як умею і як здолею ў маіх умовах, пражываючы на адшыбе ад беларускага асяроддзя”. Як этнограф прымаў удзел у працах навуковага гуртка БГКТ, а таксама праводзіў навуковыя даследаванні народнай культуры перш за ўсё Сакольскага і Гайнаўскага паветаў. У 1957-1975 гадах Мар'ян Пецюкевіч друкаваўся ў „Ніве”.

22 кастрычніка 2004 г. у Торуньскім этнаграфічным музеі адбыўся навуковы семінар „Мар'ян Пецюкевіч. Жыццё і дзейнасць”, якога арганізатарамі былі Этнаграфічны музей імя Мар'і Знамяроўскай-Прыфяровай у Торуні, Торуньскі аддзел Польскага людазнаўчага таварыства і Кафедра міжнародных узаемаадносін Універсітэта Мікалая Каперніка ў Торуні. У семінары ўдзельнічалі сям'я Мар'яна Пецюкевіча, супрацоўнікі Торуньскага этнаграфічнага музея з яго дырэктарам Раманам Тубаям, прадстаўнікі Польскага людазнаўчага таварыства з яго старшынёю д-рам Аляксандрам Блахоўскім, навуковыя супрацоўнікі Універсітэта Мікалая Каперніка з кіраўніком Кафедры міжнародных узаемаадносін праф. Збігневам Карпусам, а таксама госці з Беларусі і Польшчы.

Як першы з дакладам выступіў праф. Станіслаў Аляксандровіч, які даказаў, што веды пра гісторыю і культуру краіны з'яўляюцца найважнейшымі для нацыянальнай свядомасці. Прафесар успомніў трагічныя лёсы беларускіх дзеячоў міжваеннага часу: Браніслава Тарашкевіча, Францішка Аляхновіча і Мар'яна Пецюкевіча. Ганна Музалеўская-Аляксандровіч, захавальнік фондаў Архіва Торуньскага этнаграфічнага музея, пашырыла, карыстаючыся новымі архіўнымі знаходкамі, біяграму Мар'яна Пецюкевіча, якую ўпершыню прадставіў дырэктар Раман Тубая ў 1984 г. з нагоды вечарыны ў Торуньскім музеі, прысвечанай памяці этнографа. Аляксандр Панцялейка, супрацоўнік Гісторыка-краязнаўчага музея ў Браславе, сказаў як захоўваецца памяць пра Мар'яна Пецюкевіча на яго радзіме. Ён прадставіў дзейнасць Браслаўскага музея дзеля захавання матэрыялаў, якія тычаць беларускага этнографа. Гэта перш за ўсё кантакты з сям'ёй, навуковыя кантакты з архівамі і музеямі ў Беларусі, Польшчы, Літве і новыя экспазіцыі і публікацыі, прысвечаныя сыну Браслаўскай зямлі. Элеанора Зянкевіч, таксама супрацоўнік Браслаўскага музея, распавяла пра звычаі і абрады вёскі Цяцеркі, калі жыў Мар'ян Пецюкевіч. Удзельнікі семінара маглі паслухаць запісы ўспамінаў жыхароў Браслаўшчыны пра Мар'яна Пецюкевіча. Госці з Браслава перадалі дырэктару Торуньскага музея традыцыйна на ручніку хлеб — сімвал беларускай зямлі. Даклад пра даследаванні Мар'янам Пецюкевічам культуры стараабрадцаў на Браслаўшчыне і іх значэнне зачытала д-р Вольга Лабачэўская з Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры ў Мінску. Д-р Галена Глагоўская з Кафедры беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку сказала пра ролю ксяндза Віктара Шутовіча ў фармаванні нацыянальнай свядомасці Мар'яна Пецюкевіча. Гэтыя кантакты мелі ўплыў на яго беларускую дзейнасць у міжваенны час. Яна таксама пазнаёміла слухачоў з літаратурнай спадчынай беларускага дзеяча. Артур Трапшыц з Этнаграфічнага музея ў Торуні прадставіў шматбаковую працу этнографа ў Торуньскім музеі, таксама як дакументаліста, бібліятэкара, вучонага. Гражына Харытанюк з Кафедры беларускай культуры Універсітэта ў Беластоку паведаміла пра даследаванні Мар'яна Пецюкевіча на Беласточчыне і яго супрацоўніцтва з „Нівай”. Міраслава Штольберг-Быблюк, дачка Мар'яна Пецюкевіча, расказала пра лёсы сваёй двухкультурнай польска-беларускай сям'і, пра талерантнасць і пра яе цудоўныя адносіны з бацькам. Потым успаміналі этнографа прысутныя: дырэктар Раман Тубая, д-р Аляксандр Блахоўскі, былы дырэктар музея, а таксама члены сям'і: дачка Марыля Пецюкевіч, зяць праф. Мар'ян Быблюк, праўнучак Мікалай, які ведае свайго прадзеда толькі з успамінаў. Свае ўспаміны праслаў Мацей Канапацкі, былы журналіст „Нівы”. Падчас семінара можна было паглядзець выстаўку прысвечаную жыццю і дзейнасці Мар'яна Пецюкевіча, якую падрыхтавала Ганна Музалеўская-Аляксандровіч. На другі дзень адбылася імша за душу Мар'яна Пецюкевіча ў акадэмічным Свята-Духаўскім касцёле ў Торуні, пасля якой удзельнікі пераехалі на магілу этнографа, дзе ўсклалі сімвалічныя кветкі.




*Надмагільная пліта*

Гэта быў адзін з нямогіх семінараў, прысвечаных беларускім дзеячам, а напэўна першы такі багаты, прысвечаны Мар'яну Пецюкевічу, падчас якога паявілася шмат новых інфармацый пра жыццё і дзейнасць беларускага этнографа. Перш за ўсё торуньскае этнаграфічнае асяроддзе даведалася пра дзейнасць свайго былога супрацоўніка на беларускай ніве. Усім было цікава паслухаць беларускія літаратурныя творы Дзеда Марціна або Марвіча (псеўданімы М. П.), якія адкапала ў архівах д-р Галена Глагоўская і пазнаёміла з імі слухачоў. Беларусам цікава было паслухаць пра этнаграфічную дзейнасць на Торуньскай зямлі. Госці з Беларусі даказалі, што на радзіме беларускага дзеяча і вялікага патрыёта памяць пра яго застаецца жывая. Сустрэча ў Торуні была чарговым прыкладам суіснавання дзвюх культур. Сам Мар'ян Пецюкевіч, як беларус, працаваў для беларускай культуры да канца жыцця, але таксама як супрацоўнік Торуньскага музея ўпісаўся ў краявід польскай пасляваеннай этнаграфіі.

**Гражына Харытанюк**

# *Сінтэз розуму і сэрца*

Першая сустрэча з прозай Міхася Андрасюка адбылася ў мяне на пачатку 2001 года. Прачытаўшы зборнік яго апавяданняў „Фірма”, я была прыемна кранута і падзялілася сваімі ўражаннямі з чытачамі штотыднёвіка „Ніва” (№ 10, 2001 г.).

Сёння трымаю ў руках новую кнігу — „Мясцовая гравітацыя”. Жыццё пульсуе ў ёй усімі колерамі вясёлкі. Тут, як і ў папярэднім зборніку, пісьменнік застаецца верным сваім прынцыпам рэалізму ў адлюстраванні жыцця павятовага горада.

Не змушаючы сябе, не заганяючы свой талент мастака ў пэўныя рамкі, Міхась Андрасюк не смакуе з цнатлівасцю інтымнае жыццё герояў, а спачувае ім, саграваючы сваім сэрцам. Ачалавечаная любоўю да простых людзей, яго праўда не коле ў вочы, а падтрымлівае і дапамагае.

Але гэта зусім не азначае, што пісьменнік згуртоўвае вакол сябе чытачоў, што аддаюць перавагу не правілам, а выключэнням з правіл. Свабодны і шырокі талент яго дае нам магчымасць самім выбіраць планку, якая будзе рэгуляваць нашы адносіны да герояў.

Цалкам згодна з шаноўнай Галінай Тварановіч наконт таго, што ў апавяданнях Міхася Андрасюка „жыццё простага чалавека... рэалізуецца з пазіцыі ўдзельніка, добразычлівага назіральніка падзей і чалавечых лёсаў”, а „галоўным пафасам творчасці, вызначальнай унутранай пазіцыяй «белавежца» бачыцца любоў, павага да чалавека”.

Пашчасціла Гайнаўцы мець у асобе Міхася Андрасюка такога мастака, што абдорвае сваіх чытачоў падзеямі штодзённага жыцця гараджан, сваіх сучаснікаў, каб назаўсёды „прапісаць” іх у гісторыі горада.

Гарачы прыхільнік жаночай прывабнасці Марусь, якога ў самы адказны момант так падвёў пузыр („У цягніку”); смешныя ў сваіх пакутах „дзецяробы” Грыша Грынь і Вітусь Агоньчык; нерашучы пан Носік, які не здолеў зрабіць крок у напрамку змянення свайго лёсу („Спатканне”); Папусь і Болюсь, што так не па-сяброўску „кінулі” свайго сябрука, „паімеўшы” ягоную дзяўчыну („Гравітацыя”); змораны творчымі пошукамі мясцовы „паэт” Саша Перчук („Верш”); пан Сенька, які ўвесь час рупіўся над бутэлькамі, каб забяспечыць кватэрай у Беластоку наймалодшанькага сыночка („Знічка”).

Асаблівую цікавасць выклікала ў мяне мова апавяданняў — жывая, выразная, з добрай доляй гумару, што сягае ад літаратурных нарматываў да дыялектаў прыпушчанскага краю: „зацухмолены горб лесвіцы”; „жанчыны забіваюцца ў новыя сукенкі”; „адбіўшы капслю, заправіў вантробы глытком гаркоты”; „прыхапіла мікрафон і моцным альтам паехала ў натоўп”; „пашчасціла адшукаць дзверы ў дамашняе прыстанішча”; „пачуўшы маладыя галасы, той-сёй дзядок выдаўжае ў іх напрамку свае крокі”; „з парога расплачваецца з жонкай, аддае ў яе руплівыя рукі прыбытак апошняга месяца”; „паглыбляецца ў талерку цёплага спакою і маленькай стабільнасці”; „а на трэцім паверсе чакала пані Носічка, прыдбаная за жонку даўным-даўно таму назад, у выніку палымянага і, як наогул у маладосці бывае, зусім неабмеркаванага пачуцця”; „яна тузанула яго высока ўзведзеным жыватом. «Пазнаеш», — спытала. І ён па сённяшні дзень адбіваецца ад гэтай прыгажуні трыма сотнямі злотых у месяц. І шукае нешта знаёмае ў маленькім тварыку, у вачах, у вуснах, ва ўсмешцы. Але адшукаць знаёмае не атрымліваецца. «Як у балота ідуць тры сотні», — думае Грыша”.

Прозу Міхася Андрасюка можна чытаць запар па некалькі разоў. І кожны раз хмялець ад яе з новай сілай.

**Тамара Лаўранчук**
**г. Высокае**

*Цікавы распавед маюць і Баранавічы, назва, якіх нібыта паходзіць ад баранчыка, якому пакланяліся прыйшоўшыя заваяваць славянскія землі татары...*

# baranavichy.at.tut.by

На свеце шмат харадоў, якія адыгрывалі важную ролю ў гісторыі. Каля іх адбываліся пераломныя бітвы, у іх жылі знакамітыя людзі, былі пабудаваны цікавыя па архітэктуры будынкі. Адным з такіх без перабольшвання можна назваць заходнебеларускія Баранавічы — горад з выдатнай і слыннай гісторыяй. А каб больш пра яе даведацца, варта зазірнуць на сайт baranavichy.at.tut.by.

Галоўная старонка не надта аздобленая разнастайнымі ўпрыгожаннямі, але ўтрымлівае столькі інфармацыі, колькі на старонцы зместу вялікай кнігі. Пасярэдзіне — назва сайта „Баранавічы ва ўспамінах". Над гэтымі словамі невялікая рамка з інфармацыяй аб надвор'і ў гэтым горадзе. Праўда, падаецца яна па-расійску. Па баках два лунаючыя бел-чырвона-белыя сцяжкі. А пад назвай — вялікі пералік артыкулаў і фотаздымкаў, прысвечаных Баранавічам.

Пачынаецца ўсё як звычайна ў распаведах пра гісторыю — аб міфах і легендах, паданнях і падзеях, якія, нібыта, даюць пачатак таму ці іншаму гораду. Цікавы распавед маюць і Баранавічы, назва якіх нібыта паходзіць ад баранчыка, якому пакланяліся прыйшоўшыя заваяваць славянскія землі татары. Каб прачытаць аб гэтым, трэба папросту клікнуць на адпаведныя загалоўкі, якія адпавядаюць розным старонкам сайта.

Наступнай ідзе старонка з фотаздымкам і невялікім распаведам аб падзеях 1905 года на баранавіцкай чыгунцы.

Цікавымі інфармацыямі пра баранавіцкія ваколіцы стогадовай даўніны дзеліцца з віртуальнымі вандроўнікамі тагачасная „Наша Ніва":

„У панядзелак 24 серпня ў нашага пана Обуховіча касілі гарох 6 касцоў — тры падзёньнікі, а тры панскія парабкі.

Трэба-ж як раз здарыцца жыду с торбай гарэлкі за плечамі, каторую ён нёс з Ліпаўскай манапалькі да сябе ў в. Панютычы. «На мясьліваго і зьвер бяжыць», — падумалі хлопцы, угледзеўшы гарэлку. Ешчэ смачней здалася яна ім калі дастанецца дарма. На словы жыда: «Бог помач» касцы кінуліся на яго с крыкам: «Давай гарэлку», і доўга не чэкаючы, адабралі гарэлку, дый, як кажэ жыд, дасталі з кішэні 22 руб. 98 кап. грошэй і марынерку с тутунём. Бедны жыд прыйшоў у суседнюю вёску Высокую Ліпу і стаў жаліцца селянам. Яму спачатку ня верылі, бо дзіўна, каб сярод белага дня можна было зрабіць гэткую штуку. Але як пайшлі людзі на тое мейсцэ, то знайшлі пад пракосам гароху гарэлку; адзін паўбутэлек быў ужо парожні. Знойдзеную гарэлку жыд забраў да дому, а грошы так і прапалі. Нет ведама, шо з гэтага выйдзе?"

Але, зразумела, не толькі падобныя падзеі адбываліся ў Баранавічах і іхніх наваколлях. Перадваенныя гады добра апісваюцца ў кнізе польскага камуністычнага дзеяча Ежы Путрамента, дзе ён апісвае вучэнні царскага войска каля вёскі Лясная. Праўда, прачытаць гэтую кнігу праз даны сайт у Інтэрнэце немагчыма — выйсця да яе няма. Але чытачам „Нівы" не цяжка знайсці яе ў бібліятэцы, бо рэквізіты выдання падаюцца ў поўнай меры.

А распавед пра баранавіцкую гісторыю, а разам з ёй і агульную беларускую працягваецца. Практычна кожны год адлюстраваны на галоўнай старонцы калі не падрабязнай інфармацыяй, то старымі фатаграфіямі. Мы можам пабачыць, як выглядалі калісьці баранавіцкія цэрквы, касцёлы і сінагогі.

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Чэмпіянат быў досыць бурлівым — дастаткова сказаць, што палова клубаў памяняла галоўных трэнераў. Мінскае „Дынама" ў суверэннай гісторыі стала чэмпіёнам 7-ы раз і праз 7 гадоў...*

# Беларусь, беларусы...

### Кожнаму брату па дукату

14-ы чэмпіянат Беларусі па футболе, які прайшоў у цікавым змаганні, завяршыўся. Надышла пара раздаць, як кажуць, кожнаму брату па дукату. Турнірная табліца расставіла клубы ў наступным парадку: 1) „Дынама" (Мінск) — 75 пунктаў, 2) БАТЭ (Барысаў) — 70, 3) „Шахцёр" (Салігорск) — 65, 4) „Тарпеда" (Жодзіна) — 59, 5) „Гомель" — 46, 6) „Тарпеда"-СКА (Мінск) — 46, 7) „Нёман" (Гродна) — 40, 8) „Дынама" (Брэст) — 39, 9) „Днепр-Трансмаш" (Магілёў) — 37, 10) „Нафтан" (Наваполацк) — 35, 11) „Дарыда" (Ждановічы) — 35, 12) „Славія" (Мазыр) — 31, 13) „Зорка"-ВА-БДУ (Мінск) — 29, 14) „Лакаматыў" (Віцебск) — 27, 15) МТЗ-РІПА (Мінск) — 27, 16) „Белшына" (Бабруйск) — 12.

Упершыню ў адпаведнасці з рэгламентам спатрэбіўся дадатковы матч за правa застацца ў вышэйшай лізе. На нейтральным полі ў Баранавічах сталічныя „трактаразаводцы" ўпэўнена адолелі віцебляная — 4:1. Такім чынам развіталіся з вышэйшым класам „Лакаматыў" з берагоў „Дзвіны" і бабруйская „Белшына". На змену ім у наступным сезоне прыйдуць пераможцы першай лігі — мінскі „Лакаматыў" і рэчыцкі „Ведрыч-97" (абодва клубы ўжо выступалі ў мацнейшым дывізіёне).

Чэмпіянат быў досыць бурлівым — дастаткова сказаць, што палова клубаў памяняла галоўных трэнераў. Мінскае „Дынама" ў суверэннай гісторыі стала чэмпіёнам 7-ы раз і праз 7 гадоў. Каманда найбольш забіла і найменш прапусціла галоў. Адзначым першы сур'ёзны поспех як трэнера Юрыя Шуканава, які завяршыў гуляць сам. Барысаўскі БАТЭ, хоць і саступіў у змаганні за золата, але пацвердзіў рэпутацыю самой стабільнай беларускай каманды (7 гадоў запар [!] барысаўцы не злазяць з п'едэстала — 2 золата, 4 срэбра і 1 бронза). Удалы сезон правёў салігорскі „Шахцёр" — спярша падначаленыя маладога трэнера Юрыя Вяргейчыка заваявалі Кубак краіны, а пасля бронзавыя медалі ў чэмпіянаце (паўтарыўшы пазалеташні поспех). Цікава адзначыць выразнае дамінаванне камандаў Мінскай вобласці — іх у шасцёрцы мацнейшых ажно пяць. Найбольшым расчараваннем турніру акрамя „Белшыны" стаў яскравы „адкат" леташняга чэмпіёна „Гомеля".

Лепшым бамбардырам першынства Беларусі стаў форвард наваполацкага „Нафтану" Валеры Стрыпейкіс — 18 галоў, на адзін мяч ад яго адстаў нападнік брэсцкага „Дынама" Раман Васілюк, 16 галоў на рахунку дарыдаўца Аляксандра Сакалова. Па сістэме гол плюс пас мацнейшымі сталі Стрыпейкіс і Васілюк — па 23 пункты, на трэцім месцы хаўбек чэмпіёнаў Андрэй Разін — 22.

Завяршалі сезон матчы 1/8 фіналу Кубка краіны. Гродзенскі „Нёман", які глядзеўся шэра ў чэмпіянаце, закончыў год на мажорнай ноце, адолеўшы ўладальніка кубка „Шахцёр" (1:1 і 4:2 у серыі пасляматчавых пенальці). Гучна бразнулі дзвярыма старажылы вышэйшай лігі бабруйскія шыннікі — яны перамаглі мінскае „Дынама" — 1:0. Удаўся „дэмбельскі акорд" і Юрыю Пунтусу — БАТЭ адолеў у гасцях брэсцкае „Дынама" — 2:1, а нязменны рулявы барысаўцаў годна развітаўся з сваёй камандай. Акрамя названых у вясенні чвэрцьфінал Кубка выйшлі „Баранавічы", „Днепр-Трансмаш", „Гомель", „Дарыда" і МТЗ.

**Уладзімір Хільмановіч**

# *Занатоўкі кантрабандыста*

### Добрыя немцы

*Я сустрэў Вадзіма Гіруця на гродзенскім рынку. У гэтым тоўстым павольным чалавеку цяжка было распазнаць былога моцнага, рухавага кантрабандыста, які мог не спаць трое сутак запар і выпіць бутэльку гарэлкі залпам не закусваючы і не запіваючы. Цяпер Вадзім на запрашэнне прысесці за кубачкам піва паказаў рукой на сэрца і з выразам моцнага шкадавання на твары паведаміў, што калі ён гэта зробіць, то дактарам прыбавіцца работы. Мы проста паразмаўлялі. Вадзім, цяпер ужо сумленны прыватны прадпрымальнік, наракаў на цяжкасці сваёй прафесіі, на тое, што падатковая інспекцыя зусім звар'яцела, што санэпідэмстанцыя і пажарнікі не даюць пакою, і што нават самы задрыпаны міліцыянер лічыць сваім абавязкам праверыць, як працуюць прадпрымальнікі.*

*— Ад гэтых міліцыянтаў пакою няма, — скардзіўся былы кантрабандыст. — Лезуць ва ўсе дзіры. Душу дасталі, гады. І чаму ў нас такая паганая міліцыя? Вось у немцаў — людзі. Памятаеш як для мяне нямецкія паліцыянты, каб не пасадзіць у астрог, рызыкавалі сваёй кар'ерай. Нелегальна пераправілі праз мяжу. Таму, што людзі. Мой лёс для іх не быў абыякавы. Не тое што нашы, звяры.*

*Я амаль не задушыўся ад смеху. Толькі адвярнуўся, каб Гіруць не заўважыў гэтага. Успомніў даўнюю гісторыю. А было ўсё так.*

*Перацягнулі аднаго разу мы вялікую партыю спірту аж пад нямецкую мяжу. Маладыя яшчэ былі. Рызыкавалі галавой, а здавалася тады, што рызыкуем задніцай. Ды і час быў нейкі вясялейшы. Камунізм ляснуўся. Мы, маладыя тады беларусы, толькі пачыналі вывучаць той свет, які быў на захад ад нас. Вось і занесла нас так далёка. Не таму, што тут спірт даражэйшы, а больш таму, што хацелася пабачыць, што там на захадзе. Усё было б добра, каб Вадзім Гіруць не „залез у бутэльку". Піў бязбожна. Ды каб толькі піў. Увесь час у нейкія дурныя гісторыі трапляў п'яны. То разаб'е нос каму ў польскім бары, то з паліцыянтаў пачне здзекавацца. Маўляў, не дагоняць. Яго і сапраўды дагнаць было цяжка. Але ж лепш не выпрабоўваць лёс. І прасілі мы яго, каб супакоіўся, і палохалі. Усё без толку. Ну, думаем, накліча на нас бяду. А аднаго дня прапаў Вадзім. Дзе падзеўся, невядома. Знік як трусы з плота. Давай мы яго шукаць, людзей пытацца ці бачылі яны здаравага п'янага беларуса. Нарэшце знайшлі. Валяўся Гіруць пасярод паліцэйскага пастарунка непрытомны. Без грошай і дакументаў. Паліцыянты як даведаліся, што мы прыйшлі па яго вельмі ўсцешыліся, бо не ведалі што з ім рабіць. Але хабар усё адно загадалі даваць. Мы трохі пагандляваліся з імі наконт гэтага непрытомнага цела, а пасля Толіку прыйшла ў галаву цікавая думка. Ён і кажа паліцыянтам, што грошы дадзім колькі скажуць, але хай толькі напалохаюць Гіруця. І сказаў як. Тым самым цікава стала. Яны і пагадзіліся.*

*Толькі Вадзім пачаў прыходзіць да сябе, адзін з паліцыянтаў стаў нешта яму гергатаць, нібы па-нямецку. Другі паліцыянт прыкінуўся перакладчыкам і на ламанай польскай мове са страшным нямецкім акцэнтам перакладае, што кажа начальнік:*

*— З якой краіны прыехаў? Дзе аўсвайс? Дзе віза? Ты ў Нямеччыне. Хэндэ хох.*

*Гіруць так напалохаўся, што амаль не сказаў „Гітлер капут". Але словы заселі ў горле. А „перакладчык" працягвае:*

*— Як папаў у Дойчланд? Дзе нелегальна перайшоў мяжу? За гэта турма. Мы аддадзім цябе ў рукі спецслужбаў. Ты шпіён. І не прыкідвайся п'яным.*

*Вадзім імгненна працверазеў. Ён і праўда паверыў, што трапіў да немцаў. У яго мутных ад доўгіх перапояў вачах сталі мроіцца жахі нямецкіх турмаў. Нават нешта стаў прыпамінаць пра газавыя камеры.*

*— Хлопцы! — зароў ён як рэзаны. — Родненькія вы мае. Мой дзед за вас быў. Як я да вас трапіў, не ведаю. Мяне п'янога хіба палякі наўмысна праз мяжу перакінулі. Вы ж ведаеце гэтых палякаў. Ім абы чалавеку нашкодзіць. Пусціце вы мяне дахаты.*

*— Палякі сапраўды гэта маглі зрабіць, — пагадзіўся з Вадзімам „перакладчык". — Мы добра ведаем іх паганую натуру. Але як табе дапамагчы? Будзеш ісці назад праз мяжу, напорашся на памежнікаў. Яны цябе застрэляць, а пасля і нас у суд пацягнуць. Гэта ж табе не жарты, нелегальна мяжу перайсці.*

*— Мяне не зловяць, — угаворвае іх Гіруць. — Я ж кантрабандыст. А каб і злавілі, то вас не выдам.*

*— Добра, — пагадзіўся перакладчык. — Мы самі цябе пераправім. Ведаем тут адну патаемную сцяжынку. Але нікому не расказвай.*

*Пасадзілі яны яго ў паліцэйскую машыну, вывезлі кіламетраў дзесяць за горад, сказалі што ўжо прывезлі ў Польшчу і паехалі. А п'яны Вадзім так і не зразумеў што гэта былі польскія паліцыянты. Па сённяшні дзень не ведае. Усё расказвае людзям, якія ў немцаў паліцыянты добрыя. А людзі рагочуць. Не вераць чамусьці.*

**Сымон Нальшанскі**



Вачыма Міры

# Ідэальная пара

Кастусь Севярын нарадзіўся пад Чаромхай, у шматдзетнай сям’і як чацвёрты сын. Палеткі Севярынаў перацяла дзяржаўная мяжа, хоць у беларусаў ніхто не пытаўся, дзе б ім лепш жылося. Бацькі, Настасся і Герасім, ведалі адно: цяпер такі час прыйшоў, што вучыцца кожны можа, а нявучанаму шляхі ў свет закрытыя, асабліва сялянскаму сыну. І адправілі ўсіх дзяцей вучыцца то ў Беласток, то ў Варшаву. Інжынера мець у радні, вайскоўца, настаўніка, лекара, святара — радасць ды пашана ў людзей. Праўда, не ўсе дзеці пайшлі ў надта вялікія людзі, але адукацыю атрымалі ўсе — і шасцёра сыноў, і наймалодшая дачка. Дзеці Севярынаў удаліся на славу — і па розуме, і па красе мала дзе такіх знойдзеш. Кастусь вывучыўся на інжынера.

Кастусь Севярын кончыў Варшаўскую політэхніку. Умеў закрунуцца і на працы, ведаў таксама, з кім знаёміцца. Прыгожага, дасціпнага, бесканфліктнага беларуса любілі ўсе, і знаёмствы, яшчэваршаўскія, працягнуліся да сённяшняга часу; шмат з Кастусёвых знаёмых і сяброў — відныя постаці палітычнага жыцця розных напрамкаў. І ў сталіцы, і ў Беластоку, дзе далі яму працу аднаго з найважнейшых інжынераў. Перад адыходам на пенсію ягоны талент аздобіў сталіцу ваяводства значным чынам.

Кажуць, свой цягне да свайго. У парах таксама. Не залюбіцца певень у ластаўку ці арол у курку. Вучоная дзяўчына будзе выбіраць не менш адукаванага кавалера, а выключэнні-мезальянсы пацвярджаюць прынцып. Сустрэліся двое адукаваных, маладых і прыгожых — Канстанцін і Ідалія, пахадзілі, як то кажуць, дык і пабраліся. На шлюбным здымку на іх не наглядзецца — і самі вока ў вока сабе ўзіраюцца, быццам мёд-віно салодкае з вуснаў сабе співаюць. Ідаліі, па прафесіі псіхіятру, Кастусёвыя знаёмыя знайшлі працу ў міліцыі. Купілі вялікую кватэру, абсталявалі яе як належыцца не абы-якім людзям, што вядуць адкрыты дом, у якім гасцююць людзі з першых старонак газет.

Нарадзіўся спадарству Севярынам сын, Вальдэмар. Ужо пікаў гадзіннік — за кар’ерай і здабываннем багацця ледзь не ўпусціла Ідалія моманту, каб стаць маці. Гадавалі яго на вялікага чалавека. Школы, мовы, адпаведныя сябры, дысцыпліна, каб куды не ўлез, каб выбраў адпаведную прафесію. Хоць не меў схільнасці да медычных навук Вальдусь, давялося стартаваць у медыцынскі інстытут. На першым курсе, калі ўбачыў кроў і трупа, памяшалася яму ў галаве. Сцвердзілі шызафрэнію.

Кастусь домам не займаўся — на ўсе аплаты, пакупкі грошы даваў жонцы. Абое цікавіліся, куды інвеставаць грошы. Асабліва даспадобы былі ім шляхетныя камяні ды металы. Ашчаджалі таксама, бо мелі з чаго. Але не шкадавалі сабе прыемна правесці час, паглядзець свету ды саміх сябе паказаць. Асабліва Ідалія любіла падарожнічаць. З аднае замежнае экскурсіі вярнулася быццам адмененая.

Ідалія купіла на сваё імя новую кватэру ў элітарным раёне Беластока. Адразу падала на развод.

Аднойчы пад блёк, дзе ўвесь час жылі яшчэ разам Севярыны, пад’ехала аўтафура. Двух грузчыкаў, нейкі здаровы прыгожы мужчына, Вальдусь і Ідалія ўзламаліся ў кватэру, зняўшы дзверы з завесаў, хоць мелі ключы. Ідалія апаражніла хату з усяго — мэблі, посуду, адзення, радыё-музычнага абсталявання, каштоўнасцей. Пакінулі толькі стары матрац, коўдру з падушкай ды абшастаны камп’ютэр, на якім Кастусь праектаваў. Гаспадара пабілі, прывязанага да батарэі, абазваўшы яго ад кацапаў.

Засудзілі Кастуся сплаціць палову кватэры былой жонцы. Меў ашчаднасці 40 тысяч на аддзельнай кніжцы, дык адразу ёй аддаў. Праўда, пацвердзіла Ідалія на паперцы, што грошы ўзяла, але, аказалася, той подпіс, які склала на ёй у прысутнасці Кастуся, быў... фальшывы — гэта пацвердзіў паліцыйны графолаг. А з суда прыйшло паведамленне, што паколькі Канстанцін не рашаецца сплачваць часткі кватэры сваёй былой жонцы, фіскус сядае на ягоную пенсію і кожны месяц атрымае ён толькі чвэрць сумы грошай. З таго, што Севярыну застаецца, хапае ледзь на аплату кватэры, хлеб ды бульбу.

Піша Кастусь Севярын у суд. Кажуць ужо, што робіцца ён тыповым склочнікам, а тыя паперынкі, якія складвае сам, без адваката, — сабаку і на будку не здадуцца. Высокапастаўленыя сябры сталі лічыць, што нейкі ён ненармальны зрабіўся — адно аб сваім горы распавядае, тэм іншых не ведае. Каму хочацца сябраваць з няўдачнікам! Дурнем! Ідзі, чыстае да чыстага, багацце да багацця, справядлівае — да справядлівага...

**Міра Лукша**

*Імёны персанажаў зменены. Супадзенне герояў і фактаў — выпадковае.*

Чыгуначны транспарт на Беласточчыне

# Як у бочцы селядцоў

Пяць гадоў таму, калі ўводзілася абмежаванне хуткасці цягнікоў на лініі Чаромха — Беласток да 30 км/гадз., дык на адмыслова арганізаванай сустрэчы 16 красавіка 1999 г. у Чаромсе дырэктар Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных перавозаў у Беластоку Галіна Кужына гаварыла: „Паток пасажыраў на лініі Чаромха — Беласток складае штодзённа 1 500 чалавек. Калі абмяжуецца хуткасць (...) большая частка падарожных памяняе чыгунку на аўтамабільны транспарт. На такое нельга дазволіць”. На той жа сустрэчы спадарыня дырэктар звярнулася з заклікам да самаўрадаў і ваяводскіх устаноў аб дапамозе дзяржаўнай чыгунцы ў рамонце вышэйзгаданай лініі. Хоць адрасаты заклікаў станоўча аднесліся да чыгуначных праблемаў, рамонт сістэматычна праводзіўся, аднак пагроза ліквідацыі лініі Чаромха — Беласток ды Чаромха — Гайнаўка надалей рэальная. Многа памянялася ў краіне ў перыядзе апошніх гадоў. Перамяніліся і пачуцці дырэктар Кужыны. Западзеўся недзе даўнейшы сантымент да чарамшан. У Прадпрыемстве рэгіянальных перавозаў ад трох гадоў ні аб чым іншым не гаворыцца, як аб ліквідацыі чыгуначнага транспарту на Гайнаўшчыне. Сцэнарый для гэтай ідэі (чорны) напісаны ўласнаручна... спадарыняй Кужынай. І задума аказалася б рэальнай, каб на гэта атрымала грамадскі дазвол. Чаромхаўскі войт, як і Маршалкоўская ўправа сцяной сталі за чыгуначным транспартам. Гэтая апошняя ўстанова абавязалася дапамагчы Прадпрыемству рэгіянальных перавозаў пасажыраў купіць рэйкавыя аўтобусы, што паўплывае на абмежаванне выдаткаў ў расходзе паліва. На прамоцыі ў чэрвені мінулага года віцэ-маршалак Ян Камінскі абяцаў чарамшанам новы рэйкавы аўтобус (які памяшчае 200 пасажыраў) з прызначэннем на лінію Чаромха — Беласток. Чыгунка абяцала Маршалкоўскай управе, што пасля рамонту павысіць хуткасць да 50 км/гадз. у пачатках кастрычніка Чаромха атрымала доўгачаканы аўтобус. Праўда, не такі як абяцаў прадстаўнік Маршалкоўскай управы, але, усё ж такі, слова было стрымана. Падляшскае прадпрыемства вырашыла, што аўтобус будзе курсіраваць на лініі Чаромха — Гайнаўка і Гайнаўка — Седльцы — Гайнаўка. І тут зноў з’явілася праблема. Спадарыня Кужына быццам зламысна накіравала аўтобус з сарака чатырма сядзячымі месцамі на лініі ў гадзінах пік, калі едуць вучні сярэдніх школ на заняткі, а рабочыя на працу. Варта адзначыць, што адных вучняў ездзіць некалькі дзесяткаў (з месячнымі білетамі), не гаварыўшы аб працаўніках чыгункі, як і звычайных грамадзянах, якія ездзяць у Гайнаўку за справункамі ці да лекараў на кансультацыю.



фота www.kolej.pl

Падарожнічаў я 28 кастрычніка новым аўтобусам у Гайнаўку. На пятнаццаць мінут да ад’езду ўсе месцы былі заняты. Частка пасажыраў вымушана была стаяць на прасторным калідоры. З сядлецкага поезда пераселася больш трыццаці грыбнікоў, якія падаваліся за зялёнкамі ў Дабрываду і Палічну. Аўтобус набіты біткам. Людзі ехалі быццам селядцы ў бочцы. Па маёй ацэнцы падарожнічала ў гэты час больш за сто асоб. Падарожныя на прыпынках у Дабрывадзе, Палічнай, Вітаве ды Арэшкаве (гэтых дзесяць з месячнымі білетамі) ледзь праціснуліся ў аўтобус. Чаромхаўскія кандуктары тлумачаць, што гэта штодзённая з’ява. Не лепш справа маецца, калі пасля абеду вучні вяртаюцца дамоў, а чыноўнікі з працы, як і на лініі Гайнаўка — Седльцы і ў адваротным напрамку. Чыгуначнікі тлумачаць, што неадночы пасажыраў у перонах пакідаецца, бо новы аўтобус не можа ўсіх памясціць. Даўней курсіравалі ў гэтым часе два вагоны з лакаматывам, якія змяшчалі каля двухсот пасажыраў. Зараз яны курсіруюць а 17-ай гадзіне з Чаромхі і назад а $20^{30}$ з Гайнаўкі амаль пустыя. Што можна сказаць аб такой гаспадарцы? Легкадумнасць, ці зламысная палітыка на шкоду прадпрыемства. Як гавораць кандуктары, штодзень пасылаюць заявы пані дырэктар, а гэтая тлумачыць, што не абавязана забяспечыць пасажырам сядзячыя месцы. Што на гэта скажа дырэктар Рэгіянальных перавозаў у Варшаве? Гэта ж скандал. Разбой у белы дзень. Нездарма пасажыры мяняюць чыгунку на аўтобусны транспарт. Як далей такая палітыка будзе весціся на Гайнаўшчыне, дык прыватная лінія Пагода-экспрэс будзе царыць на нашых дарогах. Здаецца, што для Падляшскага прадпрыемства рэгіянальных перавозаў на гэтай справе залежыць.

**Уладзімір Сідарук**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
**Nakład**: 1 981 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2005 r. upływa 5 grudnia 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# *Афарызмы*
*Ладзіка Майніча*

### Каханьне

Час залечвае сардэчныя раны, толькі многія вельмі сьпяшаюцца лячыцца.

*

Шлюбы бяруцца на нябёсах, на зямлі „заключаются браки”.

*

Калі пасьля ночы хочацца глядзець жанчыне ў вочы — гэта каханьне.

*

У каханьні, як на вайне, ахвяры можна падлічыць толькі з часам.

*

Кахаць усё жыцьцё адну жанчыну — гэта альбо вялікі Боскі дар, альбо невымерная чалавечая гордасьць.

*

Каханьне толькі прыходзіць, бо адыходзіць ужо нешта іншае.

*

Разьвітаньне — гэта сама пэўны спосаб захаваць каханьне.

*

Жанчыне, якую кахаеш, можна ўсё падараваць, усё даравацы і нічога пры гэтым не атрымаць.

*

Стрэлы Амура часта разьбіваюцца аб мур чалавечага сэрца.

*

Рамэа дабіўся каханьня Джульеты, але гэта была Шэксьпірава перамога.

*

Расчараваньні ня раз паўтараюцца ў каханьні.

*

Першае каханьне рэжа, як лязо нажа, апошняе б'е як абух сякеры.

*

Стрэлы Амура часам не пасьпяваюць за стрэлкамі гадзінньіка.

*

За шчасьлівае каханьне трэба плаціць астатнім шчасьцем.


К В А Т Э Р А

**Наша журналістка (муж і дачка) шукае тэрмінова зняць невялікую кватэру ў Беластоку. Мабільнік (0) 691 698 511 або званіце ў рэдакцыю 743 50 22 у гадзінах 9⁰⁰ — 15⁰⁰.**


### Праўда пра жанчынаў

Колькасьць жанчын дабаўляе досьведу, але ня розуму.

*

Звычка жанчыны — другая натура: гараць на ёй і адзеньне й скура.

*

Дэмакратыя пераўтварае жанчыну ў дэмана.

*

У ложку кожная жанчына кошка: адзін крок ад пяшчоты да кіпцюроў.

*

Жанчынам можна сьмела гаварыць праўду — яны ёй усё роўна ня вераць.

*

У дачыненьнях з жанчынай недапушчальныя тры рэчы: падман, скупасьць і сэнтыментальнасьць.

*

Старыя каханкі зноў робяць нас маладымі.



КАСЯ КАМОЦКАЯ на „Бардаўскай восені 2004”

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

## Музычныя навіны

**Дзевятага лістапада ў Злучаных Штатах Амерыкі мелася адбыцца сустрэча маладых амерыканскіх беларусаў з лідэрам гурту „Н.Р.М.”** Лявонам Вольскім. Аднак сустрэча не адбылася. Як чытаем на афіцыйным сайце гурту „Н.Р.М.”: „На жаль, вымушаныя паведаміць, што канцэрт Лявона Вольскага ў ЗША не адбудзецца. Амерыканская амбасада адмовіла яму ў візе. Адміністрацыя і планаваная на той жа дзень сустрэча беларускай моладзі ЗША”.

**Ужо ў дзевяты раз у Варшаве адбудзецца „Беларускі андэрграунд”.** Нагадаем, што мерапрыемства ўпершыню адбылося 14 снежня 1996 г. і выступілі А. Мельнікаў і гурт „Крама”. На працягу дзевяці гадоў выступілі: „Н.Р.М.”, „Зэт”, „The Dvery”, „Zero-85”, „Кальян”, „Exist”, Віктар Шалкевіч і іншыя. Сёлета „Беларускі андэргранд” адбудзецца 25 лістапада ў кафэ „Культуральная” ў Палацы культуры і навукі (у Драматычным тэатры). У праграме выступы такіх зорак як „Уліс”, „B-3 Аркестра” і Кася Камоцкая. Арганізатары вырашылі пашырыць праграму мерапрыемства і паказаць фільм пра Васіля Быкава „Васіль Быкаў — Вяртаньне”. У час імпрэзы арганізатары будуць збіраць галасы падтрымкі пад адкрытым лістом беларускіх музыкантаў з пратэстам супраць забароны трансляваць іх музыку ў беларускіх СМІ. Арганізатарам „Беларускага андэрграунда” з'яўляецца кола Беларускага аб'яднання студэнтаў у Варшаве. Пачатак у 20:00, уступ бясплатны.

## *Адгаданка*

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | 32 | 33 | 34 | 35 | 36 | 37 | 38 | 39 | 40 |
| 41 | 42 | 43 | 44 | 45 | 46 | 47 | 48 | 49 | 50 |
| 51 | 52 | 53 | 54 | 55 | 56 | 57 | 58 | 59 | 60 |
| 61 | 62 | 63 | 64 | 65 | 66 | 67 | | | |

### *Шыфраграма*

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — народную прыкмету.

1. трава, што вырасла ў той жа год на месцы скошанай = 5 _ 4 _ 36 _ 35 _ 34 _;
2. не свята = 29 _ 30 _ 31 _ 32 _ 33 _ 14 _ 18 _;
3. забабонная даведка пра будучае, варажба = 12 _ 43 _ 37 _ 58 _ 59 _ 10 _ 11 _;
4. не перад = 17 _ 15 _ 16 _;
5. аматар, прыхільнік = 22 _ 39 _ 61 _ 2 _ 47 _ 46 _ 44 _ 45 _;
6. брыдкая лаянка або фінальная пагроза шахматнаму каралю = 54 _ 53 _ 52 _;
7. тара з палатна для захоўвання і перавозкі сыпучых рэчываў = 19 _ 20 _ 21 _;
8. матэрыял для кніжак і сшыткаў = 6 _ 7 _ 26 _ 23 _ 40 _ 41 _;
9. рак на безрыб'і = 27 _ 28 _ 24 _ 25 _.
10. пара года... у белых пейзажах Надзеі Артымовіч = 55 _ 56 _ 42 _ 38 _ 57 _;
11. разбор справы з пракурорам і адвакатам = 9 _ 13 _ 8 _;
12. цэнтральны орган крывяноснай сістэмы = 3 _ 64 _ 63 _ 65 _ 60 _;
13. 2,54 сантыметра = 66 _ 67 _ 1 _ 62 _;
14. разам з душою = 48 _ 51 _ 50 _ 49 _; **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 41 нумара**

Бізун, Германія, мужык, сястра, часнок.

Рашэнне: **Гром у кастрычніку — зіма бясснежная.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

## 21.11 – 27.11

**Баран (21.03. — 19.04.)** Пад канец тыдня можаш зрабіць шмат памылак, не будзе хацецца табе працаваць ні задумвацца над складанымі справамі. Мусіш быць сумленны ў адносінах да сябе і іншых, бо прападуць твае планы, адслоніцца штосьці, што паставіць цябе ў нязручнай сітуацыі і можа папсаваць тваю рэпутацыю.

**Бык (20.04. — 20.05.)** Усе перашкоды пераможаш „з маршу”. Ажыўленыя і прыемныя кантакты. Быкі з трэцяй дэкады зрэвідуюць адносіны з некаторымі сябрамі.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Да 23.11. будзеце вельмі прыцягальныя. Поўня Месяца (26.11.) развее некаторыя сумненні, але не прынясе вам добрага настрою. Удасца вам падагнаць амаль усе незавершаныя справы.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Ракі з 29.06. — 8.07. будуць прымушаны адмовіцца ад некаторых планаў. Не мерай завысока, бо ў найменш спадзяваны момант можаш спатыкнуцца і ўпасці. Знакаміты час на раманы. Хтосьці з Быка, Шаляў або Рыб стане табе бліжэйшы чым радня.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Яшчэ 21.11. — найлепшы час для ўсіх спраў. Квадратура Сонца з Уранам (22 — 26.11.) можа прынесці раптоўнае, але ілюзорнае захапленне, схіліць цябе да памылковага рашэння. Пазбягай стрэсу і нервовых сітуацый.

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Шалёныя сустрэчы могуць прынесці патолю толькі на хвіліну. Добры настрой, мала спраў будзе цябе раздражняць, пазбегнеш шмат стрэсуючых сітуацый, якія звычайна не даюць табе спаць. Дакладнасць у выказванні свайго пункту гледжання прынясе табе поспех.

**Шалі (23.09. — 23.10.)** Разам з трыгонам Венеры да Урана (22 — 28.11.) паявіцца ў тваім жыцці хтосьці, што замоцна закруне табе ў галаве. Будзеш неразважлівы. Асоба, з якою працуеш, можа вызваліць у табе гарачыя пачуцці.

**Скарпіён (24.10. — 21.11.)** Да 23.11. паафармляй найважнейшыя справы, добра пойдуць і фінансы. У час поўні Месяца (26.11.) не кіруйся эмоцыямі і не падымай нервовых рашэнняў. Дай сабе крыху часу, каб усё абдумаць. Палагаднееш пад уплывам Венеры, будзеш мілы, чароўны і харызматычны.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Шмат энергіі, асбаліва для Стральцоў з першай дэкады. З часовымі праблемамі памогуць справіцца сябры. Поўня Месяца ў знаку Блізнят (22.11.) — знакамітая нагода ацэнкі суадносін з партнёрам і ўсведамлення сапраўдных пачуццяў. Грошы памалу наплываюць.

**Казярог (22.12. — 20.01.)** Да 22.11. яшчэ цяжкаваты кантакт з атачэннем. Можаш дасягнуць больш, чым чакаў, хоць не ўсе прыхільныя для цябе. Блага змешчаныя пачуцці — як атрутны яд.

**Вадалей (21.01. — 19.02.)** 22 — 26.11. звернеш на сябе ўвагу арыгінальным строем, паводзінамі і бліскучай інтэлігентнасцю. Сам вырашы, ці ты гатовы на поспех.

**Рыбы (20.02. — 20.03.)** Прага духоўнай перамены. Будзеш шукаць людзей думаючых падобна. Шукаючы ідэальнага кахання, можаш загубіцца і непатрэбна пакутаваць.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960